№5 (363) 6 лютага 2004 www.nn.by

Спэцыяльны нумар

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

**Гаворка аб радзіме**
Алег Трусаў, Натальля Бабіна, Аксана Новікава ў палеміцы зь Сямёнам Букчыным.
старонка 3

**Канец вялікага расслабону**
Айчынны Левіяфан надае новы бонус.
старонка 2

**Мястэчка з помнікам Сталіну**
Вэстэрн Яўгена Бляласіна.
старонка 15

**Габрэйская дубіна наймацнейшая**
Якаў Гутман, Артур Ліўшыц і пракуратура
старонка 4

# 10 гадоў з народам



АРХІЎ ПІТА ПАЎЛАВА

НАВІНЫ

### Форум у Рызе

**5—6 лютага ў Рызе адбываецца прадстаўнічая міжнародная канфэрэнцыя «Будучыня дэмакратыі ў Балтыйскім рэгіёне», на якой значная частка часу адведзена гаворцы пра сытуацыю ў Беларусі.** Сярод удзельнікаў форуму — міністры замежных справаў Эстоніі, Літвы, Латвіі, сэнатар з ЗША Джон Макейн, прадстаўнікі Нарвэгіі, Швэцыі, Польшчы, Чэхіі, Украіны, буйных міжнародных фундацый. У Рыгу запрошаная прадстаўнічая дэлегацыя беларускага дэмакратычнага руху, якая разьлічвае ўпершыню дабіцца ад Эўразьвязу сутнаснай падтрымкі сваіх пачынаньняў.

### Лявонаў далучыўся

**Фонд, у які ўваходзяць Васіль Лявонаў, Міхаіл Чыгір, Уладзімер Някляеў, абвесьціў пра сваю падтрымку праграмы «Народнай кааліцыі 5+»** і разьлічвае, што ягоным прадстаўнікам знойдзецца месца ў адзіным выбарчым сьпісе.

### Адліга

**У Беларусі імкліва сьцяплела. 6 лютага тэмпэратура дасягне 5 градусаў у Менску і 8-мі — у Берасьці.** На наступным тыдні падмарозіць, але сыноптыкі абяцаюць вяртаньне адлігі. Фатальна, калі цяплынь датрымаецца да 14 лютага, бо прымаўка прарочыць: «Як на Грамніцы адліга, з ураджаю будзе хвіга».

### Мілошавіч падтрымаў Каштуніцу

**Палітычны крызыс у Сэрбіі пераадолены. Не, дэмакраты так і не аб'ядналіся, але Сацыялістычная партыя экс-прэзыдэнта Мілошавіча,** скінутага ў часе рэвалюцыі 2000 г., вырашыла падтрымаць урад меншасьці, які сфармуе лідэр тагачасных пратэстаў Ваіслаў Каштуніца. Дэмакратычная партыя, да якой належаў забіты прэм'ер Джынджыч, ва ўрад ня ўвойдзе.

### Керы ад дэмакратаў

**Толькі буйны скандал можа перашкодзіць вылучэньню Джона Керы ў якасьці кандыдата ад Дэмакратычнай партыі ЗША на прэзыдэнта,** пасьля таго як ён выйграў перадвыбары ў пяцёх зь сямёх паўднёвых штатаў ЗША. Тэарэтычныя шанцы паспрачацца зь ім яшчэ захоўваюць генэрал Уэсьлі Кларк і сэнатар Джон Эдвардз.

МБ

### Куды плывеш, Беларусь?

І які ж беларус ня любіць плысьці паволі? Ці ж ягонай душы, што імкнецца сузіральна супыніцца, засамоціцца, сказаць часам: «Нехяк жа будзе...», — ці ж ягонай душы не любіць гэтага? Эсэ Сяргея Харэўскага ў наступным нумары «НН».

**У кожнага часу свае песьняры. Незалежная Рэспубліка Мроя паўстала зь першымі сымптомамі back in the USSR. Зь іх песьнямі пражываліся гістарычныя пераломы і заносы. Віхурнага 96-га не ўявіць без «Партызанскай», змрочнага 99-га — без «Паветранага шару». Іх музыка была антыдотам ад навакольнага маразму, незалежна ад ідэалягічнае яго прыналежнасьці. Спрашчаюць тыя, хто лічыць «NRM» толькі адказам на выклік часу, называюць музыкаў усяго толькі «аднагодкамі Яго», якія пражылі дзесяць гадоў побач з уладай. «NRM» самакаштоўны ўменьнем «сэрца мільёнаў падслухаць біцца». Ён — нябеснае цела першай велічыні, заўважнае нават сьляпым да беларускай культуры людзям. Дасьледчыкі беларускага постмадэрнізму пачынаюць з творчасьці гэтых музыкаў, што жывуць у выпадковых кватэрах і рэпэтуюць у выпадковых месцах.**

**«NRM» можа трансфармавацца ў нешта іншае пасьля зьнікненьня нашага «маладога аўтарытарызму». У гэтым сэнсе Рэспубліка Мроя запраграмаваная на самазьнішчэньне. Але не на забыцьцё. Старонкі 5—11.**

Канцэрт «NRM» адбудзецца ў нядзелю, 8 лютага, у к/з «Менск». Тых, хто здабудзе квіток, чакае грандыёзная музычная справаздача за дзесяць гадоў. А тыя, хто не пашкадуе за ўваход 20 тысячаў, атрымаюць задарма альбом «Віза «NRM». Пачатак канцэрту а 19-й.

АД РЭДАКЦЫІ

# Ні рубля паразытам

5 мільёнаў 25 тысячаў рублёў за старонку — менавіта такі рахунак за тэлепраграму выставіла «Нашай Ніве», як і іншым незалежным газэтам, Беларускае тэлеграфнае агенцтва. «НН» падавала заяўку на шэсьць тэлеканалаў, прычым на беларускую мову агенцтва праграмы «не перакладае». Такім чынам, дорага каштуе праца спадароў па капіяваньні тэкстаў з шасьці файлаў, якія яны атрымліваюць ад тэлеканалаў, у адзін.

Так званыя «дзяржаўныя» СМІ ў Беларусі даўно ўжо ніякія не дзяржаўныя і не грамадзкія (такімі зьяўляюцца, напрыклад, Бі-Бі-Сі ў Брытаніі ці ЦДФ у Нямеччыне). Тэлеканалы і «Звёзды» манапалізаваў і выкарыстоўвае для ўтрыманьня ўлады і рэалізацыі сваіх інтарэсаў адзін клан. Замест таго каб адлюстроўваць пазыцыі розных слаёў грамадзтва, даваць слова прадстаўнікам розных палітычных сілаў, каб людзі маглі выбіраць самых талковых, яны прапагандуюць адну сілу і яе ідэалёгію, ствараюць культ аднае асобы. Абсурдная нават думка, каб прэзыдэнт Буш загадаў прадаваць тэлепраграму газэце «Нью-Ёрк таймз» за большыя грошы, чым «Вашынгтон пост». Або каб прэзыдэнт Квасьнеўскі даВеў міністрам заданьні па скарачэньні аўдыторыі «апазыцыйнай» «Жэчпасполітай».

Прадаючы «дзяржаўным» газэтам ТВ-праграму за 35—50 тыс. рублёў і выстаўляючы незалежным выданьням рахунак на 5 мільёнаў, улады разьлічваюць аслабіць свабодную прэсу. У іх разьліку адны незалежныя газэты ня змогуць сабе дазволіць купляць тэлепраграму і страцяць частку чытачоў праз гэта, а другія будуць яе набываць за казачную цану і такім чынам пагоршаць сваё фінансавае становішча, а сьледам і якасьць, і таксама страцяць частку чытачоў.

Карацей, у гэтым нумары ТВ-праграмы вы ўжо ня знойдзеце. Шукайце яе ў тэлетэксьце ці бясплатных газэтах. А як што — дык і зусім не глядзіце таго тэлебачаньня: не падурнееце.

На сайце агенцтва БелТА ахвотным набываць тэлепраграму прапануецца кантактаваць праз тэлефоны або электронную пошту з наступнымі асобамі:

Бясьсьмертны Аляксандар. Тэл. 226-02-97. E-mail: albes@belta.by

Даведкі па цэнах: Хандогіна Алена. Тэл. 222-30-40. E-mail: marketing@belta.by

Упэўненыя, што вы набывалі «НН» не дзеля тэлепраграмы.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Ян Ігеланд: Забывайце Чарнобыль

**Беларусь наведаў намесьнік генэральнага сакратара ААН у гуманітарных пытаньнях Ян Ігеланд. Ягонае меркаваньне: трэба быць рэалістамі й разумець, што прайшло 18 гадоў пасьля Чарнобылю.** Цяпер у сьвеце існуюць іншыя праблемы — Ірак, Аўганістан, Іран. ААН будзе канцэнтравацца на сацыяльным разьвіцьці пацярпелых рэгіёнаў, інфармаваньні насельніцтва аб правілах бясьпечнага пражываньня ва ўмовах радыеактыўнага забруджаньня. Прыклады, калі людзі вяртаюцца ў некаторыя рэгіёны, зь якіх раней выяжджала насельніцтва, Ігеланд лічыць «цудоўнымі й пазытыўнымі», бо «людзям вяртаецца надзея».

ЛЕВЫМ ВОКАМ



# Канец вялікага расслабону

**Абыякавасьць, адсутнасьць дысцыпліны, расхлябанасьць, безадказны падыход да справы — пасьля трагедыі ў Краснапольлі гэтыя і іншыя цялесныя практыкі беларусаў апынуліся па-за законам.**

Прайшла інфа, што рыхтуецца новы дэкрэт аб дысцыпліне. Пры гэтым чыноўнікі апускаюць важны момант: дысцыпліна ёсьць перш за ўсё падпарадкаваньнем цела ўладзе, або, кажучы труізмамі Фуко, палітэканамічным захопам цела. Улада навязвае целу патрэбныя ёй практыкі з мэтай выкарыстаньня яго як палітычнага інструмэнту і вытворчай сілы.

Папярэднія формы кантролю цела ў Беларусі былі сапраўды прымітыўнымі. Негалосная сацыяльная дамова будавалася паводле наступнага ўзору: «Я, (імя і прозвішча), і дзяржава РБ ўступаем у дамову. За тое, што я ня буду падтрымліваць апазыцыю, дзяржава надае мне прывілей не напружвацца на рабочым месцы, халтурыць, нешта некалі піянерыць, у абедзенны перапынак расслабляцца «Крыжачком». Подпіс. Дата».

Канец вялікага расслабону значыць перагляд кантракту. Цяпер айчынны Левіяфан надае адзіны бонус — працаваць як робат і адчуваць афігіцельны гонар за сваю краіну. Стварыць новага Франкенштайна зьбіраюцца за кошт чарговага курсу ў школах і прапагандысцкай кампаніі.

Аляксандар Рыгоравіч, дарагі. Схадзіце, калі ласка, у цырк і паглядзіце на найбліжэйшых родзічаў чалавека — малпаў. Няўжо вы думаеце, што гамадрыл аўтаматычна скача з тумбы на тумбу таму, што дрэсіроўшчык прагрузіў яго лекцыяй аб інфармацыйнай вайне, якую вядзе Захад супраць славянства? Чалавечыя, рухомыя, расплывістыя, лянівыя ад прыроды генэтычныя аўтаноміі трэба муштраваць. Іншых падыходаў гісторыя не ведае.

Зразумела, сацыяльна-эканамічныя ўмовы краіны, ВУП якой расьце на 10% штогод, не дазваляюць ахапіць усё грамадзтва дысцыплінарнымі ўстановамі. Аднак і тут ёсьць выйсьце. Чаму б не зьвязаць новыя цялесныя тэхнікі з звычайнымі занятками беларусаў? Напрыклад, прыняць статут для тых, хто саджае (зьбірае) бульбу або зграбае сьнег.

Гэта будзе проста казка. Прыяжджаеце вы, скажам, у Пружаны, а дачнікі вас сустракаюць адпаведна пункту статуту «Выпаленьне прывітаньня прэзыдэнта з лапатамі і граблямі, на месцы і па ходзе руху»: па камандзе «Для сустрэчы прэзыдэнта (лева, з фронта), на кала-вур» дачнікі, якія знаходзяцца ў шыхце, прымаюць страявую стойку і адначасова паварачываюць галовы ў бок прэзыдэнта, праважаючы яго поглядамі».

Праблема апазыцыі вырашаецца. У любы момант франдзёраў можна адправіць на губу за размоўчыкі ў страю і няхлюйны выгляд.

**Лёлік Ушкін,
левы тусоўшчык**

# А ВУП расьце

**Ноў-хаў у эканоміцы, вартае ўганараваньня Нобэлеўскай прэміяй, адкрыла Нацыянальная акадэмія навук.**

Вынаходзтва акадэміка ў датычыць крыніцаў папаўненьня дзяржаўнага бюджэту. Кожнаму акадэмічнаму інстытуту Прэзыдыюм даў заданьне прынесьці прыбытак у N мільёнаў рублёў, дарма што сама акадэмія дагэтуль — бюджэтная ўстанова. Нескладана зразумець, адкуль возьмуць грошы фізікі, хімікі, біёлягі: іх распрацоўкі можна ўкараніць у прамысловасьць. За правы ўдзельнічаць у раскопках на тэрыторыі Беларусі Інстытут гісторыі можа атрымаць грошы з замежных археолягаў. Але адкуль узяць прыбытак інстытутам фундамэнтальных фізічных дасьледаваньняў, літаратуры, мовазнаўства, мастацтвазнаўства, этнаграфіі й фальклёру? Здавалася б, чыста акадэмічныя сфэры навукі.

Вынаходлівае кіраўніцтва Акадэміі знайшло выйсьце. Грошы можна атрымаць, калі зьбіраць частку грантаў з праектаў, якія ажыцьцяўляюць навукоўцы. Напрыклад, аддзел аднаго акадэмічнага інстытуту падаў заяўку ў Фонд фундамэнтальных дасьледаваньняў на грант у 20 млн., атрымаў і палову з сумы адразу пераВёў у якасьці прыбытку ў «бюджэтныя» выплаты. І нікога не хвалюе, што Фонд фундамэнтальных дасьледаваньняў, які фундуе гуманітарныя праекты, таксама мае дзяржаўныя крыніцы фінансаваньня.

А ВУП расьце-е-е!..

**Аркадзь Шанскі**

ДАСЛОЎНА

### Мы і людзі

«Трэба яшчэ раз узварухнуць грамадзтва і асабліва кіраўнічы склад, павярнуць іх да адказнасьці перад людзьмі. І людзей таксама напружыць на ўсю катушку, бо дзвары й дахі нiхто людзям чысьціць ня будзе. Там, дзе мусяць рабіць людзі, яны павінны рабіць, дзе мусім мы — мы павінны гэта рабіць», — **Аляксандар Лукашэнка пра бягучую сытуацыю.**

ШТО РОБІЦЦА

### Канібал нарасхват



42-гадовы Армін Майвэс, які забіў і зьеў бэрлінскага інжынэра — зрэшты, са згоды апошняга, — асуджаны ў першай інстанцыі на восем з паловай гадоў турмы, а цяпер завалены прапановамі аб продажы аўтарскіх правоў на сваю змрочную гісторыю, як на кнігі, так і на фільмы. Таксама яго асаджаюць журналісты з просьбамі аб гутарках. Людажэр з Ротэнбургу «яшчэ не пасьпеў азнаёміцца з усімі прапановамі і не перайшоў да больш канкрэтных дзелавых перамоваў», — паведаміў ягоны адвакат.




## Невядомая аповесьць Быкава

**При канцы красавіка 1998 году, вымушана пакідаючы Беларусь, Васіль Быкаў перадаў літаратуразнаўцу Міхасю Тычыну папку колеру марской хвалі. У ёй ляжаў машынапіс новай аповесьці. Быкаў прасіў пачакаць з друкаваньнем гэтага твору: «Пакуль што ня час»…**

**Аповесьць «Аўганец» друкуецца ў новым нумары часопісу «Дзеяслоў». Пытайцеся ў кнігарнях і ў незалежных распаўсюдніках.**

ПРАВЫМ ВОКАМ



# Дык не падпісвайся!

**Ганчарык падпісаў прафсаюзы. Колас падпісаў Ліцэй. Трусаў падпісаў цэлы ТБМ.**

Прыгадалася мода даўніх гадоў — сутычкі «пацаноў» раён на раён, двор на двор, «хабза»—«тэхнар», «мэталісты»—«валністы» etc. Залавілі ўвечары чужынца, навешалі яму. Той пабег да сваіх, скалацілі брыгаду, адпомсьцілі. За тых «падпісаліся» старэйшыя — і пакацілася. Рэйтынг тынэйджэра залежаў ня толькі ад таго, ці добра ён «махаецца», але і ад колькасьці тых, хто за яго гатовы «падпісацца». Некаторыя, ня маючы шырыні ў плячах ды кулакоў набітых, прыдумлялі сабе самі салідную «падпіску»: брата-дэсантніка ці дзядзьку-аўтарытэта.

У сёньняшняй Беларусі палітычныя адносіны простыя й прадказальныя, бы ў савецкіх дварах. Адзінае, што падпісваць кудыкольвек цяпер прынята не сяго-таго, а «свае структуры», часьцяком не спытаўшы пра тое ў іх.

Вось Ганчарык падпісаў быў свае прафсаюзы — вынік вядомы. Колас у сваю паліткампанію, якая ўсё ніяк не пачнецца, падпісаў Ліцэй. Соўгаюцца цяпер дзеці, цярэбяць навуку па кватэрах. Трусаў, далучыўшыся да «пяцёрачнікаў», падпісаў цэлы ТБМ — зьбірае ахвяраваньні на арэнду новага офісу. Калі схематыка наступстваў нагэтульki ўстойлівая й гадамі праверанaя, дык мо варта думаць наперад, перш чым падпісвацца? Мо варта адказьней ставіцца да «сваіх структураў», судносіць імаверную рызыку і магчымы плён?

Да поўнага камплекту засталося Вольскаму падпісаць у якую-небудзь апазыцыйную кампанію фанатаў «NRM», надоўга разьвітаўшыся з канцэртнымі заламі. Але, відаць, Лявон чалавек мудрэйшы. Ён сам узводзіць «раён», у якім сам жа становіцца «каралём». Ён не пераразьмяркоўвае ўплываў і не далучаецца да ўплывовых плыняў, ён сам стварае і ўплывае. Паважаю, Лявоне.

**Вацлаў Заякоць**

**Рэдакцыя атрымала шэраг водгукаў на артыкул «Тлустая рыса пад мінулым» і дыскусію, якую ён выклікаў. Прапануем іх Вашай увазе.**

## Мы згуляем, а вы падтрымайце

**Беларусам (маю на ўвазе беларусаў па культуры, па палітычным мысьленьні, па самасьвядомасьці) адмаўляецца ў праве на ўласную палітычную гульню.** «Мы згуляем, а вы падтрымайце», — вось чаго ад іх чакаюць. Прычым для гульцоў гэта настолькі натуральна! Ніхто не падазрае беларусаў у жаданьні стаць акупантамі. Мы прыдатныя толькі на ролю калябарантаў пры тым ці іншым рэжыме. Як толькі беларусы прапануюць уласную стратэгію, гэта выклікае раздражненьне і вокрык.

**Аляксандар Шапіра, Берасьце**

## Горыч і неўразуменьне

**Горыч і неўразуменьне выклікала зьяўленьне ў «Народнай волі» артыкулу С.Букчына «Старый-новый облик коллаборантов, или Под чем предлагают подвести «жирную черту» «социально близкие».** С.Букчын спрачаецца з апанэнтам старым, нядобрым, праверанным яшчэ Азаронкам шляхам падмены паняцьцяў, ператоргваньня фактаў і несумленнага мантажу.

Замест пярэчаньняў па сутнасьці ён торгае цытаты і выдзірае з кантэксту асобныя фразы. Такая сацыяльная замова: стварыць вобраз зьвера-нацыяналіста зь любога, хто мае сьмеласьць любіць сваё. Гэтую замову выконвалі свáім часам Азаронак, Зімоўскі, Чайка, цяпер да кампаніі далучыўся яшчэ і Букчын. Ад ягонага артыкулу патыхнула нянавісьцю да беларускага. Альбо беспрынцыповасьцю.

**Натальля Бабіна**

## Рацыю вызначыць будучыня

**Вырашыць, хто мае рацыю ў гэтай цікавай спрэчцы, можа толькі час, а аргумэнты ёсьць на карысьць і адной, і другой пазыцый.**

Прывяду прыклады зь нядаўняга мінулага. Юзаф Пілсудзкі для аднаўленьня незалежнасьці Польшчы заключыў дамову зь Нямеччынай ды Аўстра-Вугоршчынай і ў выніку атрымаў да моманту паразы гэтых краін у першай сусьветнай вайне польскія легіёны. Стваралiся яны для барацьбы з Расеяй, але адразу ўзялі ўладу ў Польшчы пасьля вайны. Апраўданы саюз для палітыка з двума тагачаснымі ворагамі «свабоднага сьвету»? Думаю, што так, бо ў выніку Польшча зноў стала дзяржавай.

Пасьля другой сусьветнай вайны ў пазыцыі палітыкаў ЗША і Эўропы адносна СССР былі два пункты гледжаньня: 1) разграміць СССР і вызваліць ягоныя народы, пакуль СССР у вайсковых адносінах не зрабіўся мацнейшым за Захад; 2) разьлічваць на тое, што СССР не пачне вайны безь відавочнай перавагі, і адначасова гуляць з камунізмам, разьлічваючы на паступовую «дыфузію». І ў пачатку 90-х здарылася так, як меркавалі прыхільнікі другога пункту погляду. Значыць, мелі рацыю яны! А калі б незадоўга да сваіх хаўтураў СССР са злосьці запусьціў дзясятак ракет, каго б мы цяпер лічылі правымі?

Прымаючы рашэньні такіх маштабаў, палітыкі бяруць на сябе вялізную адказнасьць. Правільнасьць гэтых рашэньняў знаходзіцца недзе побач з магчымасьцю ў прынцыпе прадказваць будучыню.

Дзякуй за цікавую спажыву для розуму!

**Аксана Новікава**

## Зь Пілсудзкім Лукашэнку...

**Цікава, што зь Пілсудзкім Лукашэнку часта параўноўвае расейскі палітоляг-«беларусазнаўца» Фадзееў.** Гэта ў вачах С.Букчына Севярынца і Вячорку дзеляць неперааадольныя супярэчнасьці. А для замежніка, і гэта пацьвердзіў Рагозін, што Лукашэнка, што Пазьняк — усе іншародцы, варожыя расейскім інтарэсам. Гора і ганьба нашым Лукашэнкам і Пазьнякам, што яны не працьверазеюць і ўсё думаюць кожны пра сваю гульню.

**Сяргей Мінкевіч, Менск**

## Вы агент?

**Па форме ўсе насельнікі Беларусі для іншых зьяўляюцца беларусамі.** Але для ўнутранага разьвіцьця нацыянальнай дзяржавы важны зьмест. Калі прэзыдэнт размаўляе на мове суседняй дзяржавы, ці можа ён быць шанаваны карэнным жыхарствам? Калі Вы, спадару Дынько, зьяўляецеся носьбітам аўтэнтычнай (ліцьвінскай) мовы, элітай гэтай часткі насельніцтва і ня бачыце несумяшчальнасьці нацыяналізму беларускага і ідэалёгіі расейскага нацызму, то я прыходжу да высновы, што Вы агент расейскага імпэрыялізму, засланы для таго, каб канчаткова асыміляваць беларусаў-ліцьвінаў.

**Ліньнік М., Кобрынь**

## Пяць гадоў і стагодзьдзе

**Сямён Букчын папракае Заякоця, што ён усё дараваў бы Лукашэнку, абы той загаварыў пабеларуску.** А для такіх, як Заякоць (і я), мова — гэта сапраўды ўсё. Гэта сьвет, у якім я жыву, гэта мой хлеб а віно.

Я хачу такую дэмакратыю, пры якой мова вярнула б сабе свой пасад. І іншая мяне мала цікавіць. Бо дэмакратыю, як паказаў прыклад Гішпаніі ды Партугаліі, можна адбудаваць за гадоў пяць. А от калі мову страцім, страцім зусім як пачуцьце, дык і за сто гадоў, і ніколі можна будзе не адрадзіць.

Дык не папракайце нас мовай, Сямёне.

**З.Пя-ч, Менск**

# Хто баіцца дыялёгу апазыцыі з уладамі?

Цікавы чалавек Сямён Букчын. Па-першае, сапраўдны дэмакрат, ня тое што некаторыя «сацыяльна блізкія», ды яшчэ і «нацыянальна абмежаваныя», а па-другое — вельмі любіць Расею і асабліва расейскі народ, які «издревле нам родной». Іншая справа, ці любіць расейскі народ Сямёна Букчына? Але, як мы ведаем, любоў бывае «без адказу».

А вось тых, хто перашкаджае вядомаму журналісту любіць Расею, спадар Сямён ня любіць і змагаецца зь імі з усяе моцы. Апошні ўдар нанёс ён на старонках «Народнай волі» (№243—244 ад 20 сьнежня) па рэдактару «НН» і ўсім яе рэдакцыйным калектыве, прычым біў, як кажуць, «пад дых», каб і іншыя баяліся. Але пачнём па парадку.

Хто такія калябаранты? Вядома, Андрэй Дынько, Сяргей Дубавец, спадар Заякоць і іншыя ворагі Расеі. А чаму? А таму, што прапануюць уладам і апазыцыі выпрацаваць адзіную пазыцыю ў адносінах да Расеі, якая, дарэчы, даўно глядзіць на Беларусь як на нейкую недарэчнасьць. Прычым погляды як «левых», так і «правых» тут цалкам аднолькавыя.

А можа, «господин» Букчын, Вам варта зазірнуць у «Тлумачальны слоўнік» беларускай мовы, якую Вы так ня любіце, бо на ёй гавораць і нават выдаюць газэты спадары «калябаранты»? Адкрываем адпаведны том і на старонцы 580 чытаем: «Калябарацыяніст — здраднік, які супрацоўнічаў з ворагамі сваёй радзімы ў час акупацыі яе фашысцкімі войскамі ў пэрыяд другой сусьветнай вайны». Цікава, а як называлася Радзіма ў беларусаў 1 верасьня 1939 г., калі пачалася другая сусьветная вайна? Частка зь іх жыла ў Польшчы і змагалася з фашыстамі, як, напрыклад, малады дэсантнік марской пяхоты Янка Брыль. Другая частка жыла ў СССР і 17 верасьня ў складзе Чырвонага войска ўдарыла зьнянацку ў тыл тым, хто ваяваў з фашыстамі, а потым правяла зь імі ваенны парад у Берасьці, дзе свастыка сябравала з чырвонай зоркай. Дык хто зь іх калябарант? І аб якой радзіме ідзе гаворка? І пры чым тут Андрэй Дынько, які вядзе гаворку аб магчымым дыялёгу апазыцыі і ўлады ў незалежнай Беларусі, якую хоча анэксаваць у выглядзе шасьці губэрняў «Паўночна-Заходняга краю» сёньняшняя Расея?

Сапраўднымі калябарантамі былі і будуць тыя, хто дапамагалі Сувораву і Мураўёву, Сталіну і Цанаву заліваць крывёй нашую Бацькаўшчыну і якія ў якасьці зброі, акрамя штыха і расстрэльнага пісталета, заўжды выкарыстоўвалі расейскую мову. Бо пакуль беларус гаворыць па-беларуску, зламаць яго немагчыма. Давайце ўспомнім, як зьмяніліся паводзіны Мечыслава Грыба, Сямёна Шарэцкага, Міхаіла Чыгіра, калі яны сталі актыўна карыстацца беларускай мовай.

Як толькі і Лукашэнка зробіць гэты крок, аб усялякай інтэграцыі з Расеяй (а гэта значыць, яе чарговай акупацыі Беларусі) можна назаўжды забыць. Але гэта яго асабістыя праблемы. Упэўнены, што наступны кіраўнік Беларусі будзе шырока карыстацца беларускай мовай, бо мова і незалежнасьць — гэта дзьве перадумовы заможнага жыцьця грамадзян Беларусі ў складзе аб'яднанай Эўропы.

Цікава даведацца, як Сямён Букчын бачыць пераход ад аўтарытарнай улады ў Беларусі да дэмакратычнай? Ёсьць некалькі традыцыйных шляхоў.

Шлях першы — польскі. Апазыцыя становіцца адзінай, мае моцнага ўплывовага лідэра, спачатку прымушае ўлады сесьці за стол перамоваў, каб зьмяніць выбарчае заканадаўства, а потым выйграе выбары, як парлямэнцкія, так і прэзыдэнцкія.

Шлях другі — румынскі. Улады супраціўляюцца да апошняга, пакуль разьюшаны натоўп не захоплівае, разам з войскам і міліцыяй, уладу гвалтам і прымусам.

Шлях трэці — тувінскі. Прыходзіць «добры дзядзька» з Масквы, як гэта было ў нашай гісторыі ў 1793 ці 1996 гадах, і навязвае, шляхам подкупу і ўзброенай сілы, свой варыянт прымусова-добраахвотнага злучэньня зь вялікай Расеяй. Дастаткова ўспомніць, як у 1944 г. зьнікла з мапы сьвету Тувінская Народная Рэспубліка, альбо лёс рэспублікі «Сярэдняя Літва», што ў 1922 г. зьядналася з Польшчай. І тады нашыя хлопцы зноў стануць «гарматным мясам» новай, імпэрскай Расеі, паедуць у Чачэнію, Дагестан і на таджыцка-аўганскую мяжу.

Таму галоўная задача апазыцыі — знайсьці з уладай супольную мову ў інтарэсах нашых дзяцей і ўнукаў, бо толькі першы шлях дасьць нам добрае і заможнае жыцьцё. Як гэта зрабіць? Штодня займацца шэрай, незаўважнай палітычнай працай, якая дасьць плён толькі пры супольных намаганьнях усіх партый і рухаў.

Прывяду некалькі прыкладаў.

Ішла чарговая падпісная кампанія. Усе ведаюць, у якім цяжкім фінансавым стане цяпер незалежная беларуская прэса. Чаму б актывістам апазыцыйных партый і рухаў не заняцца гэтай праблемай? Можа, варта хлопцам з «Маладога фронту» замест паездкі ў Башкірыю паездзіць тыдзень у нашых электрычках і раздаваць людзям падпісныя квіткі на тую ж «Народную волю»? Чаму б лідэрам «пяцёркі» не аб'явіць збор сродкаў на падпіску незалежных газэт для інвалідаў, пэнсіянэраў, шматдзетных сем'яў і студэнтаў?




PHOTO.BYMEDIA.NET

**Ёсьць некалькі шляхоў: польскі, румынскі і тувінскі.**

Неўзабаве жыхары Менску і іншых гарадоў Беларусі атрымаюць квіткі на аплату сваіх кватэр, роўныя мінімальнай пэнсіі. Дзе пікеты, дэманстрацыі, мітынгі, улёткі з патрабаваньнем спыніць «шок без тэрапіі» і замест будаўніцтва лядовых палацаў зьнізіць памер кватэрплаты для маламаёмных? Зьнесьлі ў Менску гандлёвыя шапікі, забаранілі прадаваць на вуліцах садавіну і гародніну. Дзе апазыцыя, якая зьбірае подпісы грамадзян сп.Паўлаву з пратэстам, дзе журналіст-дэмакрат Сямён Букчын? Дзе дапамога брацкай Расеі? Сямён Букчын у гэты час піша чарговы адлуп «калябаранту» Дынько.

Апазыцыя павінна ня толькі ўвесь час лаяць уладу і кожнае лета казаць, што зімой «станець фабрыкі і заводы», а ўмець і пахваліць яе асобных прадстаўнікоў за добрыя справы. Напрыклад, за адбудову менскай Ратушы альбо за адмову пераходзіць у ліпені 2003 г. на безнаяўны расейскі рубель. Толькі тады, калі кожны чыноўнік ведае ў твар кіраўніка мясцовай апазыцыі, калі яны раніцай вітаюцца, разам удзельнічаюць у гарадзкіх культурніцкіх ці дабрачынных мерапрыемствах, паміж імі магчымы дыялёг і разумны кампраміс.

Як не падтрымаць, напрыклад, рашэньне Канстытуцыйнага Суду аб невыкананьні пункту дзейнай Канстытуцыі пра роўнасьць беларускай і расейскай моваў? Да прыкладу, навошта Сямёну Букчыну перакладаць зь беларускай мовы выказваньні «нашаніўцаў», калі яго спрэчку зь імі «Народная воля» можа надрукаваць на мове Коласа і Купалы? Але ж тады адданасьці Букчына «расейскай справе» не зразумее «вялікі ўсходні брат». У сваім змаганьні зь беларушчынай журналіст перайшоў на пазыцыі сумнавядомага «Политического собеседника» і выкарыстаў пудзіла «нацыяналізму» разам з антысэмітызмам.

Дык хто баіцца дыялёгу апазыцыі з уладамі? Ці ня «брацкая, дэмакратычная» Расея? Бо тады імпэрскія лёзунгі, такія, як «падзяляй і пануй» і «Масква — трэці Рым, а чацьвертаму ня быць», трэба будзе назаўжды выкінуць на звалку гісторыі.

**Алег Трусаў,**
кандыдат гістарычных навук

З УСЁЙ КРАІНЫ

## Марудлівыя карткі

**Тынкоўшчыца Тамара Васілевіч з Баранавічаў атрымала 600-тысячную плястыкавую картку ў краіне.** «Беларусбанк» пералічыў на шчасьлівую картку 600 тыс. рублёў і падараваў кабеце тэлевізар. Аднак простыя людзі, якіх прымушаюць карыстацца карткамі, ня вельмі радыя. У горадзе падчас выдачы заробкаў утвараюцца вялізныя чэргі да банкаматаў, якіх не стае. Да таго ж, ня ўсе ўмеюць імі карыстацца. У крамах расплачвацца тою карткаю марудна — амаль у пяць разоў даўжэй, чым гатоўкаю. Самі прадавачкі таксама ня ўмеюць толкам карыстацца карткамі. А ў касах ды тэрміналах трэба выстойваць чаргу гэтулькі ж, колькі некалі па жывыя грошы.

**Руслан Равяка, Баранавічы**

## Прадаюцца гатэль і нафтабаза

**Тры пакупнікі прэтэндуюць на выстаўлены на аўкцыён напаўразбураны будынак бабруйскага гатэлю «Эўрапейскі».** Таксама плянуецца продаж былой вайсковай нафтабазы, якая знаходзіцца ля чыгуначнай станцыі.

**Віктар Качан, Бабруйск**

## Пікет супраць Шуста

**«9 гадоў — гэта занадта!» Пад такім лёзунгам 29 студзеня ў Пінску адбыўся пікет, які арганізавалі сябры Беларускага Хельсынскага камітэту і партыі БСДГ С.Касьцюковіч і М.Мядзьведзеў.** Такім чынам яны адзначылі дзевяцігадовы тэрмін знаходжаньня ва ўладзе кіраўніка мясцовай «вэртыкалі» Васіля Шуста. Пікетоўцы зьвярнулі ўвагу жыхароў Пінску на пагаршэньне эканамічнага становішча ў горадзе, выкліканае неэфэктыўным кіраваньнем, і запатрабавалі адстаўкі старшыні гарвыканкаму ды найбліжэйшага атачэньня.

Нягледзячы на халоднае надвор’е, удзельнікі пікету больш за гадзіну прастаялі перад будынкам падатковай інспэкцыі, трымаючы ў руках плякаты з надпісамі: «В.Шуст — у адстаўку!», «Не дыктатуры!», «Работу выканкаму — пад кантроль пінчукоў» і інш. Большасьць мінакоў падтрымала акцыю, а праяжджаючыя міма «легкавікі» віталі ўдзельнікаў пікету гукамі клаксанаў.

**Барыс Ашкеназі, Пінск**

## Штраф з уцекачоў

**Адміністрацыя ВНУ мае намер зьвярнуцца ў суд з патрабаваньнем да бацькоў студэнтаў, якія засталіся пасьля адбыцьця практыкі за мяжой, аплаціць кошт выдаткаў на іх навучаньне — па 600 эўра за кожны навучальны год.** Летась дзесяць студэнтаў Сельскагаспадарчай акадэміі засталіся ў Вялікай Брытаніі, дзе былі на практыцы. Студэнты, якія вярнуліся з-за мяжы, сцьвярджаюць, што тыя, хто застаўся, знайшлі сабе добрую працу, якая дазваляе выплаціць пазыку навучальнай установы і працягнуць навучаньне за мяжой.

**«Региональные ведомости», Горкі**

## Пчолы нанесьлі

**Незвычайнайшым чынам захоўваў марыхуану жыхар Горак: дзьве з паловай кілі наркотыку ён схаваў у пчаліным вульлі.** Наўрад ці, думаў, хто сунецца правяраць у тым вульлі, але дарма. «Аматару пчолак» пагражае ад 3 да 7 гадоў пазбаўленьня волі. І ніякае марыхуаны.

**Паводле «Магілёўскай праўды»**

# Бедныя бяднеюць, багатыя багацеюць

**З 1 лютага вырасьлі пэнсіі — працоўныя (разам зь мінімальнымі), сацыяльныя, а таксама падвышкі да пэнсіяў асобным катэгорыям грамадзян. У сярэднім пэнсіі ўзрасьлі на 17,6%.**

Сярэдні памер пэнсіі ў сьнежні склаў 113,9 тыс. руб. Гэта ўсяго толькі 69% ад пэнсіянэрскага мінімальнага спажывецкага бюджэту, які, як вядома, не адлюстроўвае рэальных патрэбаў старога чалавека. Сэрэдні памер пэнсіі па гадах склаў 119 тыс. руб., па інваліднасьці — 106,1 тыс. руб., сацыяльнай пэнсіі — 51,6 тыс. руб. У параўнаньні са сьнежнем 2002 г. рэальны памер пэнсіі ўзрос усяго на 1%.

Што самае прыкрае, у цяперашнім падвышэньні пэнсій закладаецца яшчэ шырэйшы «відэлец» паміж мінімальным і максымальным памерам пэнсіі. Мінімальныя пэнсіі маюць узрасьці зараз толькі на 12,6%, а пэнсіі, памер якіх перавышае сярэдні, — аж на 18,9%. Як той казаў, «бедныя бяднеюць, багатыя багацеюць». Калі сярэдняя пэнсія не дацягвае да мінімальнага спажывецкага бюджэту (нават і заніжанага), дык найбяднейшыя пэнсіянэры так і застануцца за рысай галечы. А тыя, хто атрымліваў добрую пэнсію і не бедаваў, зараз будуць атрымліваць яшчэ больш! Напрыклад, адстаўны вайсковец, зьвязаны з нашай краінай толькі рашэньнем бязьбедна правесьці тут старасьць, — усе 400, а то і 500 тыс.

**Дамінік Міхайловіч**

# Габрэйская дубіна наймацнейшая

## Супраць антысэмітызму: дзьве тактыкі



PHOTO.BYMEDIA.NET

Прэзыдэнт зарэгістраванай у ЗША Усясьветнай асацыяцыі беларускіх габрэяў (УАБГ) Якаў Гутман 14 і 21 студзеня правёў акцыі пратэсту каля Адміністрацыі прэзыдэнта. Гутман выступаў супраць палітыкі дзяржаўнага антысэмітызму, якую, на ягоную думку, праводзіць беларуская ўлада. Абедзьве акцыі скончыліся затрыманьнем габрэйскага актывіста. У перапынку паміж імі ён правёў галадоўку. Магчыма, апошняя сталася прычынай таго, што з другога пікету сп. Якаў патрапіў адразу ў больніцу ў перадінфарктным стане.

Гутман лічыць праявамі менавіта дзяржаўнага антысэмітызму зьнішчэньне сынагогі на вул.Дзімітрава ў Менску й разбурэньне падмуркаў Халоднай сынагогі, будаўніцтва на жыдоўскіх могілках у Мазыры й зьнішчэньне там памятнага знаку па ахвярах Галакосту, разбурэньне могілак у Рагачове й рэканструкцыю стадыёну ў Горадні, які стаіць на месцы былых могілак.

Больш за ўсё Гутмана абурае тое, што ягоныя намаганьні не знаходзяць падтрымкі нават у праваабаронцаў: «Ні Заля, ні Купала не былі ні габрэямі, ні праваабаронцамі. Але яны ўзьнялі свой голас супраць несправядлівасьці. Няўжо праціўнікі цяперашняга рэжыму не разумеюць, што габрэйская дубіна ў руках апазыцыі — наймацнейшая ў гэтай спрэчцы?»

Самае апошняя кара, накладзеная на прэзыдэнта УАБГ, — штраф на карысьць прадпрыемства «Мазырскі камунальнік». З ініцыятывы Гутмана ў Мазыры быў усталяваны помнік габрэям, што загінулі там у часе другой сусьветнай. «Мазырскі камунальнік» зьнёс помнік і патрабуе ад Гутмана заплаціць 212.238 руб., каб кампэнсаваць выдаткі на дэмантаж і добраўпарадкаваньне тэрыторыі. Гутман плаціць не зьбіраецца.

Ацэнкі Гутмана перабольшанымі лічаць нават прадстаўнікі габрэйскай грамадзкасьці. Юрыст Артур Ліўшыц, прадстаўнік Камітэту падтрымкі габрэяў на тэрыторыі былога СССР, адзначае: «Сытуацыя насамрэч вельмі складаная. Але казаць пра палітыку дзяржаўнага антысэмітызму, якая мела месца ў Савецкім Саюзе, неабгрунтавана. Ёсьць канкрэтныя дзеяньні канкрэтных чыноўнікаў, але ўказаньняў «зьверху» не прыходзіць».

Дзеяньні Гутмана выклікаюць у А.Ліўшыца стрыманую рэакцыю: шмат шуму, але мала плёну. Паводле ягоных словаў, сёньня габрэйскія арганізацыі змагаюцца з парушэньнямі закону іншымі сродкамі: лістамі да адпаведных органаў мясцовай улады, зваротамі ў пракуратуру й г.д. І ўсё адно: «Вельмі часта габрэйскім рэлігійным суполкам не вяртаюць былой нерухомай маёмасьці: няма закону аб рэстытуцыі». Рэальнай карысьці ад лістоў не нашмат больш, чым ад пікетаў Гутмана.

**Аркадзь Шанскі**

ХРОНІКА СУПРАЦІВУ

Прадпрымальнік Сяргей Атрошчанка і кіраванае ім ТАА «Альянс-мэдыя» 15 студзеня падалі пазовы — кожны па 50 млн руб. — на газэту **«Народную волю»**. 29 студзеня судзьдзя Фрунзэнскага раёну Юлія Лукомская прысудзіла **Аксану Новікаву** да штрафу ў 200 базавых велічыняў: 11 лістапада Новікаву затрымалі каля Менгарсуду з плякатам «Беларусі патрэбны суд прысяжных». Агулам у спн.Аксаны ўжо амаль 8 млн. штрафу, якія яна не зьбіраецца плаціць. Падатковыя органы налічылі **Беларускаму Хельсынскаму камітэту** запазычанасьць па падатках і эканамічныя санкцыі больш чым на 380 млн руб. У штрафы былі залічаныя нават гранты TACIS і Эўракамісіі, якія ня мусяць абкладацца падаткамі, згодна зь беларускім заканадаўствам. 29 студзеня судзьдзя Менгарсуду Аксана Будоўская прыняла рашэньне аб ліквідацыі праваабарончай арганізацыі «**Незалежнае таварыства прававых дасьледаваньняў**». У Барысаве ў той самы дзень супрацоўнікі міліцыі ў цывільным за распаўсюд бюлетэню «Права на волю» затрымалі «зуброўцаў» **Паўла Паддубнага**, **Алеся Казакова** і **Алеся Перальгіна.** На іх склалі пратаколы і адпусьцілі. «Белсаюздрук» адмовіўся распаўсюджваць незалежную газэту **«День»**, не зважаючы на папярэдне падпісаныя кантракты. 2 лютага суд Цэнтральнага раёну Менску аштрафаваў журналістку **Натальлю Каляду** на 20 б.в. за парушэньне арт.167 АК (дзейнасьць ад імя незарэгістраваных ці неперарэгістраваных палітычных партыяў, прафэсійных саюзаў і грамадзкіх арганізацыяў): яна ўдзельнічала ў стварэньні сайту «Хартыі’97». 2 лютага **Арцём Бурыла** быў аштрафаваны Цэнтральным судом Гомелю на 50 б.в.: хлопец прывёз з Украіны ў Беларусь старыя ўлёткі, якія запрашалі на грамадзкае галасаваньне па трэцім прэзыдэнцкім тэрміне на 7 лістапада 2003 г. Мытнікі палічылі гэта ўвозам друкаванай прадукцыі, хаця сам хлопец казаў, што возіць з сабой макулятуру, бо шкадуе выкінуць. Судовая пастанова па прыцягненьні да адказнасьці **Ўладзімера Лабковіча**, юрыста ліквідаванага Праваабарончага цэнтру «Вясна», 3 лютага была адмененая. За ўдзел у акцыі пратэсту ў будынку Вярхоўнага суду пасьля ліквідацыі «Вясны», Лабковіч атрымаў быў 10 б.в. штрафу, але судзьдзя Дзьмітры Жданок ня даў яму перакладчыка. Справа накіраваная на новы разгляд.

**АШ**

ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

## Спынены імпарт электраэнэргіі

**1 лютага былі цалкам спыненыя пастаўкі электраэнэргіі з Расеі.** Летась электрычнасьць куплялі ў Расеі па $1,68 за кВт/г. Сёлета расейскія вытворцы выставілі «Белэнэрга» тарыф $2,16. Беларусы палічылі, што таньней абыдзецца вырабляць энэргію на сваім мазуце. «Белэнэрга» мае намер купляць украінскую ці латвійскую энэргію. Украінцы маюць лішкі ўвесь час, а «Латвэнэрга» — у часе паводак на Дзьвіне. Штогоду Беларусь спажывае каля 34 млрд кВт/г энэргіі, 26 млрд зь іх яна прадукуе сама.

У найбліжэйшыя гады мяркуецца на заходнія крэдыты пабудаваць ГЭС на Нёмане і вугальную ЦЭЦ у Берасьці. У Менску ж выпрацоўваць электраэнэргію плянуюць са сьмецьця. На месцы былога канцлягеру «Трасьцянец» з дапамогай нямецкай фірмы «УПМ» мае паўстаць завод для перапрацоўкі сьмецьця пры нізкіх тэмпэратурах.

## Можна пазычаць у далярах

**Канстытуцыйны суд прызнаў адпаведнымі Канстытуцыі палажэньні Грамадзянскага кодэксу, згодна зь якімі замежная валюта можа быць прадметам дамовы пазыкі.** Гэта пакладзе канец супярэчлівай судовай практыцы, калі часам такія пазыкі абвяшчаліся юрыдычна несапраўднымі і грошы канфіскоўваліся. Грамадзяне могуць выкарыстоўваць валюту для пазыкаў, іх вяртаньня і атрымання працэнтаў за карыстаньне пазыкамі.

## Рост цэнаў на газ і электрыку

**Мінэканомікі задняй датай — з 1 студзеня — падвысіла цэны на электраэнэргію, цяпло й газ для суб’ектаў гаспадараньня,** адпаведна на 22,9%, 22,9% і 24,2% (да $56,8 за 1 тыс. кубоў). Ільготы захаваныя толькі для вясковых прадпрыемстваў.

## «Альфа» адмаўляецца ад «Комплексбанку»

**У «МенскКомплексБанку» завяршыла працу часовая адміністрацыя Нацбанку.** Яна была ўведзеная для паляпшэньня фінансавага стану і трымалася пяць месяцаў. Банк мае сам шукаць інвэстараў, якія маглі б палепшыць яго фінансавы стан. Раней на кантрольны пакет акцый банку прэтэндавау расейскі «Альфа-Банк», аднак цяпер ён адрокся такой ідэі.

## Ліквідацыя банкаў

**Шэсьць з паловай гадоў доўжылася ліквідацыя «Чысьцінвэстбанку».** Цяпер працэдуру банкруцтва ці ліквідацыі праходзяць «БелБалтыя», «БелКамБанк» і «Беларускі Біржавы Банк».

## «Юкас» верне Мажэйкяй?

**Расейскі канцэрн «Юкас» разглядае магчымасьць продажу Літве 53,8% акцый нафтаперапрацоўчага заводу ў Мажэйкяй.** Такую заяву зрабіў прадстаўнік канцэрну на перамовах з старшынём Сойму Літвы. Вольню непакоіў лёс нафтаперапрацоўкі ў сьвятле канфлікту «Юкасу» з Крамлём.

**МБ; БелаПАН; радыё «Свабода»**

# Тэрыторыя гульні

## Гутарка зь Лявонам Вольскім

**«НН»: Зь юбілеем! 10 гадоў — сур'ёзны тэрмін у такім хуткаплынным сьвеце, як наш. Якія пляны на наступныя дзесяць гадоў?**

**Лявон Вольскі:** Мне здавалася, што «NRM» і не праіснуе гэтулькі. Я думаў, гэта кароткі зорны праект — мільгане й згасьне. Цікава, колькі ж яно можа цягнуцца? Мы з Алезісам знаёмыя ўжо 20 гадоў. Мы ўжо ня ходзім адзін да аднога на дзень народзінаў і не сьвяткуем сьвятаў разам. Ведаем, што рана ці позна трэ будзе сесьці ў аўтобус і месяц ехаць па гарадох і весях. Мы ніколі ня лаемся ў турах, зьвяртаючыся да гумару абсурду ў нашых вымушаных стасунках. У нас мала рэпэтыцыяў, але яны напоўненыя й напружаныя. Як памірала «Мроя», мы вымушалі сябе тры разы на тыдзень зьбірацца й вымучана граць па тры гадзіны. А цяпер песьні так і ляцяць.

Няўжо мы будзем у 50—55 гадоў стаяць на сцэне і гэта будзе нармальна ўспрымацца? Як Філ Колінз, Стынг ці дзядулька Озі Осбарн.

Калі мне стукнула трыццаць, я пачаў замоўчваць узрост. А то ўдруг дзевачкі скажуць: «Эта старык!» Або як прызнацца, што я жанаты? Зорка рок-н-ролу й жанаты? Гэта нейкія падлеткавыя комплексы. Дзесяць гадоў мы народ абуджаем, кудысьці клічам, а народ сыходзіць працаваць інжынэрамі ці зьзжджае за мяжу — і ўсё. І новыя прыходзяць, фанацеюць, адгукаюцца на нашыя крыкі, ідуць з намі. А потым адыходзяць.

**«НН»: Купляць дублёнку-прапітку й гадаваць дзяцей.**

**Л.В.:** Ну, безумоўна. Таму й цікава, у што гэта выльецца «NRM» — каманда артыстычная, інтуітыўная, непрафэсійная. Эвалюцыя можа быць любая.

**«НН»: Днямі Вас у «Советской Белоруссии» абвесьцілі арыстакратам у трэцім калене...**

**Л.В.:** «СБ» стварыла на мяне магутнае ўражаньне. Як ад філіі нейкай расейскай газэты ў Беларусі. Тут Прасьнякоў нейкі, а побач такі запаведнічак — хай і пра Беларусь нямножка. Было неяк — фірма «БелПІ» замовіла рэклямны артыкул пра «Крамбамбулю» ў «СБ». Яго Мухін напісаў. Дарэчы, ён піша, што немагчыма чытаць. Як нейкі стары пень. Ці як старанны вучань: яму сказалі — і ён перапісаў нешта з маіх старых інтэрвію. Перакапаў архівы. Са мною, лішне казаць, ён вырашыў не сустракацца. І вось выйшаў мёртвы артыкул з нашым з Анечкаю фатаздымкам — абсалютна мярзотным (такі сямейны алькагалізм). А Дайнекі зь «БелПІ» пакрыўдзіліся, што ня іхны фатаздымак увайшоў у матэрыял (гэта ж трэ было журналісту ячшэ й не дамовіцца зь імі). І пасьля гэтага ўсё — «БелПІ» супрацу з намі перапыніла. І цяпер купіў «СБ» — там пра мяне два словы й дыхтоўны фатаздымак у гарнітуры, з абсэнтам. Далей гляджу — «аацечасьцьвенныя навасьці», а там усё пра Расею: гэты сюды паехаў, а той туды...

**«НН»: Алсу зацяжарала?..**

**Л.В.:** Там не пра такіх, а пра нейкіх сьпікераў — я і прозьвішчаў такіх ня ведаю. Тры выступоўцы з Расеі, адзін зь Беларусі: «Я таксама імею атнашэніе, мой дзед быў зь Ленінградзкага шасэ». Усе замілавана сьмяюцца. Канкрэтна адзіная прастора з Расеяй. І ўсё напісана такім стылем, быццам выцягнулі з 1983 г.

**«НН»: Выцінкі газэтныя пра сябе зьбіраеце, хоць бы з таго ж 1983 году?**

**Л.В.:** Ёсьць альбом выцінак, press-book, увесь пайшоў Віктару Дзятлікоўічу ў ягоныя маскоўскія рукі. Піша кнігу пад рабочаю назвай «Ад «Мроі» да «NRM». Бярэ зацяглыя інтэрвію ва ўсіх, што назаўтра кепска адбіваецца на ягоным здароўі.

**«НН»: Як Вам у ролі сэкс-сымбаля, якім Вы сталі пасьля кліпу «Абсэнт»?**

**Л.В.:** Гэта гаворыць пра беднасьць нашае сцэны ў гэтым сэнсе. Я разумею, каб Тарзан які-небудзь. Ну, цяпер нам з «Крамбамбуляй» па бартэры трэнажорная заля выпала. Таму, я думаю, прыйдзецца і мне адчуць сябе сэкс-сымбалем...

**«НН»: Энэрэмаўцы ўсе на машынах, у трэнажорных залях... Вы абуржуазіліся?**

**Л.В.:** Збуржуазіцца можна толькі ў краіне, дзе ёсьць буржуазія, капіталізм у нейкай ступені. У нашай краіне капіталізм выбітны і не падобны ні да чога. У нас ёсьць вельмі багатыя людзі, але гэта не капіталісты, а людзі, прыкрытыя нейкімі структурамі. Вось падатковая паліцыя — багатыя людзі, Дэпартамэнт па фінансавых расьсьледаваньнях — багатыя. У іх добрыя машыны, кватэры, загарадныя дамы. Пакуль можна дэманстраваць сваё багацьце, яны дэманструюць. Ня ведаю, куды яны хаваюць астатнія грошы.

**«НН»: Як гэта ўсё пачыналася? Чаму Вы выдумалі «Мрою», «NRM»? Як спалучалі зь іншымі мастацтвамі?**

**Л.В.:** У юнацтве ты ўспрымаеш рок-музыку як рэлігію. Гэта сусьветная супольнасьць, панітаваная нябачнымі нітамі. Своеасаблівая масонская лёжа. Ты гаворыш сабе: ніколі ў жыцьці я ня буду граць нічога іншага. Калі сталееш, разумееш, што рок — гэта шаманская сугестыўная культура, якая будуецца, хутчэй за ўсё, на паганскіх традыцыях. Але калі яна працягвае дамінаваць і тады, калі чалавеку трыццаць і болей гадоў, гэта, на мой погляд, не зусім нармальная зьява. Можа, таму мы зь сябрамі стварылі і «Крамбамбулю» ў дадатак. Да «Крамабамбулі» быў «Народны альбом» зь ягоным станоўчым зарадам або «Сьвяты Вечар» — суцэльны пазытывізм. Увесь склад «Мроі», а потым «NRM» граў у «Новым Небе».

**«НН»: Адкуль прыходзяць ідэі?**

**Л.В.:** Нешта лётае ў паветры. Я хутчэй чалавек інтуітыўны, чым структураліст. Нешта спачатку зраблю, а потым аналізую, чаму яно ўзьнікла. «А, цяпер ясна».

**«НН»: Над Беларусяй ёсьць інтуітыўнае культурнае поле, але не растуць на ім сапраўдныя культурныя героі. Чаму?**

**Л.В.:** Героі ёсьць, але яны нейкія нямоцныя. Можа, таленты кволыя і для іх тое поле трэба ўрабляць? Возьмем герояў рок-н-ролу дзесяцігадовай даўнасьці. Хто сышоў з року, хто займаецца ім, ледзь зарабляючы на пражыцьцё, хтосьці зьехаў. Вось Слава Корань — герой і малайчына, але не відаць яго нідзе.

**«НН»: А вы ня хочаце быць героем?**

**Л.В.:** Мне цікава толькі тое, што я ўмею і люблю рабіць. Зь мяне ня выйдзе ўладара дум. Прамаўляючы, я адчуваю сябе няёмка. А вось калі мая творчасьць будзе незапатрабаваная, я выйду на трыбуну і буду крычаць: «Што ж эта дзелаецца?!»

**«НН»: Лепш казаць: «Суграмадзяне! Мы будзем рабіць тое й тое!»**

**Л.В.:** Безумоўна. Але спачатку — «Што ж эта дзелаецца!!!». Як галоўная беларуская зорка й герой. Яна ж спачатку крычала: «Што ж эта дзелаецца!!!»

**«НН»: Дарэчы, вы з Лукашэнкам думаеце адзін пра аднаго?**

**Л.В.:** Ён пра мяне дакладна ня думае. Мне здаецца, што да культуры ён ставіцца паблажліва: мурашы нейкія, займаюцца неізьвесна чэм. Этага ня нада. Рэальна нада дзелаць! Ня могуць кнігі прадаць свае. Нада напісаць — прадаць, усё. Ня могуць заінцерасаваць чалавека.

**«НН»: Навукоўцы таксама бесталковыя.**

**Л.В.:** Ня могуць зарабатываць дзеньгі. У мяне ёсьць знаёмы дырэктар інстытуту, даволі пасьпяхова працавалі. Нават на заробкі людзям заставалася. Дык паглядзелі, што варушыцца, — залупілі такія цэны на арэнду, што яны ў жаху… Што я, калі нават пра Быкава ня вельмі думалі.

**«НН»: А вы думаеце пра бацьку люду беларускага?**

**Л.В.:** Быў час, што думаў і ледзь не вар'яцеў. Прасьпявалі мы «Нам усім гамон!» — і далей. Ня трэба нэгатывам грузіцца, бо цябе зруйнуе гэта. Цяпер я больш іранічны. Магу парадыяваць Лукашэнку вельмі добра. І потым мы ў «NRM» заўважылі, што Піт Паўлаў падобны да Лукашэнкі, калі яму наклеіць лысіну й вусы. Мы носімся з ідэяй выпусьціць яго на сцэну, але гэта мусіць быць канцэрт кароткі, на тры песьні.

**«НН»: Кароткі, каб не пасьпелі павязаць?**

**Л.В.:** Не. Таму што ўвойдзеш у ролю і будзеш не сьпяваць, а вішчаць і крычаць. Вось, можа, неяк на «Рок-каранацыі», калі ўдасца.

**«НН»: У позьнім загніваньні сацыялізму ў Польшчы музыкі ладзілі кабарэ, дзе ўсяляк выкпівалі ўладу. Гэта і ў нас цяпер такі час?**

**Л.В.:** Можа быць. Мы нават думалі наладзіць нейкія рэчы кшталту «Памаранчавай альтэрнатывы» — ладзіць прабегі вусатых лыжнікаў.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Працяг на старонцы 6.

# Тэрыторыя гульні

Працяг са старонкі 5.

Потым мы ў «Крамбамбулі» ўсе выйшлі з вусамі. Абсурдна-парадыйныя рэчы характэрныя для «NRM». Як толькі ў дзяржаве штосьці адбывалася, мы рабілі пародыю. І так гэта абсурдна ў Беларусі, а мы даводзілі да чарнаты. Зладзілі паралельна выбары прэзыдэнта «NRM». Вынікі галасаваньня павесілі на сайт. На першым месцы быў я, на другім — Піт, на трэцім — Юрык, на чацьвертым — Алезіс і г.д. Празь дзень мы зьнялі вынікі галасаваньня й абвесьцілі, што ўсе набралі аднолькавую колькасьць галасоў, так што застаецца ў нас Незалежная Рэспубліка.

**«НН»: Давайце пагаворым пра народ. Сяргей Дубавец разважаў неяк, што толькі Вы, Лукашэнка і Купала з Караткевічам ужывалі спалучэньне «мой народ».**

**Л.В.:** Народ? Часам ён робіцца масай, якая ідзе на выбары, часам масай, якая душыць сама сябе, як на Нямізе. А калі разьбірацца з кожным прадстаўніком натоўпу паасобку, выйдуць зусім сымпатычныя людзі. Ну што гэта — беларускі народ? Віцебскі месьціч розьніцца ад гомельскага селяніна. Гурковыя магнаты з-пад Пінску адрозныя ад вытанчаных гарадзенцаў. Я, пэўна, люблю людзей, але што такое народ?

**«НН»: Падобна, што беларускі народ і сам ня ведае, што ён такое. У нас тры партыі з адной назваю, тры калядныя дзяды, два варыянты мовы, чатыры нацыянальныя гімны, дзьве сымболікі...**

**Л.В.:** Гэта выправіцца толькі яркай і ладна сфармуляванай нацыянальнай ідэяй, дзякуючы якой падвысіцца ровень жыцьця. Разьяднанасьць — не ўнікальная беларуская зьява.

**«НН»: Асноўныя вяршыні шляху?**

**Л.В.:** У «NRM» быў пасьпяховы шлях, у адрозьненьне ад праекту «Мроя». Быў пэрыяд, недзе з год, калі мы былі маладой, падаючай надзеяй камандай. Потым мы сталі папулярныя сярод моладзевага андэрграўнду — пасьля альбому «Одзірыдзідзіна». Потым быў роўны пэрыяд узыходжаньня. Былі знакавыя акцыі: канцэптуальнае «Падарожжа на возера Трох Чарапахаў» — з прамовамі, міжнародным тэрміналам у фае, з захопам самалёта тэрарыстамі. Было «Радыё «Гамон». Выходзілі голымі на сцэну. Пашпартызацыю насельніцтва праводзілі. Мы ставіліся да гэтага з такім здаровым постмадэрнізмам. Абяцалі выпусьціць Канстытуцыю «NRM»... Мы гуляліся, гэта нам прыносіла станоўчыя эмоцыі ад публікі й грашовыя адзінкі. Мы ніколі не змагаліся за сэрцы й мазгі слухачоў, нікога не наварталі ў сваю веру. А людзі ішлі за намі, нават калі ім не падабалася штосьці. Напісалі мы пару легкадумных, дапусьцім, песень. Кшталту «Песьні пра каханьне». А нам і кажуць: «Як можна? У такі цяжкі час!» Ключавое слова для нашай творчасьці — нязмушанасьць. У нас былі паганыя песьні. Але мы іх стваралі з кайфам.

Мы граем далёка ад прафэсійнага роўню, але даём народу эмоцыі, распрыгоненасьць і пачуцьце волі. Нават стылёва мы ніколі не былі запрыгоненыя. Цяперашнія дыскусіі пра тое, што мы граем папсу, спачатку мяне нэрвавалі як чалавека «інцелігентнага, з тонкай арганізацыяй», а потым я гэта ўпадабаў. Мы ня граем поп-музыкі. Інакш бы мы былі ў полі поп-культуры, якое, дарэчы, ў Беларусі занядбанае. Беднае «Эўрабачаньне»! Што яно там убачыць?

**«НН»: Гэта страх. Ніводнай мэлёдыі не запомніш. А чаму папса такая ў нас?**

**Л.В.:** Папса — афіцыйная музыка краіны. Яна такая, як і людзі ў краіне. У Амэрыцы гэта Сьпірс ці Агілера, раней — Мадонна. Група «А-ха» — гэта Нарвэгія. А ў нас папсачы на работу ходзяць. Мы можам увогуле не паехаць на канцэрт, паламаць свой дзень: мы — не прадусарская брыгада. А калі ты частка рынку, мэханізму, які гоніць музыку, бы сталепракат, то ты набліжаешся да дзяржаўнага пэрсанажа на дзяржаўнай рабоце. Вось нашыя рабочыя, сяляне, сьпевакі павінны быць шэраньнкія й ня надта выбівацца, каб быць пасьпяховымі.

**«НН»: Гэта нацыянальны характар?**

**Л.В.:** Гэта цяпер мімікрыя. Ня трэба рабіць супэр, трэба рабіць «нармальна» — паганенька, але не зусім. Тое ж з заводамі — ты атрымліваеш сто баксаў і ня будзеш рабіць нейкі супэр. Ты паедзеш у Амэрыку гэтым займацца за дзесяць тысяч.

**«НН»: Адзін заходні журналіст напісаў, што Беларусь — заяц, прыдушаны дупамі двух мядзьведзяў.**

**Л.В.:** А можа, гэта вожык пад задамі двух мядзьведзяў? Парадаксальнае й ірацыянальнае жыцьцё нашай краіны ня спраўджвае ніякіх прагнозаў. Мы жывём у цікавай краіне, і мы можам даць вельмі цікавы прадукт, што датычна мастакоў ці музыкаў. А вось зь пісьменьнікамі што робіцца? Я ўчора думаў-думаў: чаго яны ня пішуць па-людзку? Адзін Глёбус, Арлоў...

Можа, справа ў тым, што яны пішуць на Маскву гэтыя прыгодніцкія раманы пра уркаганаў і мянтоў?

**«НН»: Або пра ваяроў зь мячамі й дзідамі.**

**Л.В.:** Што в обшчам-та адно й то жа. Папулярная літаратура забірае пісьменьніка гэтак жа, як і любая літаратура.

**«НН»: Што з Вашай кніжкай?**

**Л.В.:** Шукаю карэктара й мастака. І трэба паглядзець, што ў Віці Дзятліковіча выйдзе. Страшна... Мы былі дзецьмі, там несла само сабой, былі пэрыяды застою, песьні паганыя пісаліся.

**«НН»: Нейкая філязофская сыстэма склалася?**

**Л.В.:** Ніякай філязофіі ў маім жыцьці або праектах няма. Я б мог зараз выкруціць вам нешта прыгожае. Мы практыкавалі такое, каб ачараваць дзевушак. Але насамрэч мая тэрыторыя — гульня. Я граю розныя ролі. Можа, я й кепскі, але актор. Ва ўсялякім выпадку — артыст.

Галоўнае — навучыцца адмаўляць людзям і рабіць усё арганічна, не здаваця на гэтыя ўпросіны: пасядзіце, хлопцы, у прэзыдыюме... Ну зайграйце для нашых дзетак, яны вас так чакаюць... Прыйдзеш — а там дзесяць чалавек, якія цябе й ня ведаюць.

**Гутарыла Сьвятлана Курс**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Люты 2004, перад рэпэтыцыяй

## Прыступкі эвалюцыі

Праца над іміджам



УЛАДЗІМЕР ШЛАПАК

**1995, «Рок-каранацыя»**



АРХІЎ М.АНЕМПАДЫСТАВА

**1997, «Рок-каранацыя»**



«МУЗЫКАЛЬНАЯ ГАЗЕТА»

**1997, «Ачысьцім наш край ад чужынскіх зграй!»**



СЯРГЕЙ КАЖАМЯКІН

**1999, «Тры чарапахі»**



УЛАДЗІМЕР СКАМАРОШЧАНКА

**2002, «Дом культуры»**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**2003, «Сьвяты вечар»**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**2003, «Крам-бам-бу-ля!»**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**2003, «Віза NRM»**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**2003**

# Дасье NRM

## Лявон

Спраўляе дзень народзінаў 14 верасьня (Панна). Шырокай публіцы вядомы як Вольскі, але, згодна з пашпартнымі дадзенымі, ён Зэйдэль. Лявонавы продкі — магілёўскія немцы-лютэране. Нават яго дзядуля быў ніякі не Віталь Вольскі, а Вітальд Фрыдрых Карлавіч Зэйдэль. Во як. Мо адсюль і нямецкія цытаты ў песьнях? Лявон быў у войску. Служыў у вайскова-паветраных сілах у Слуцку. Але на самалёце лётаць яму не дазвалялі.

Мае стабільную сям'ю, гадуе дачку Адэлю (увесну ёй будзе шэсьць гадоў). Жонка Ганна дапамагае ў музычных справах — была прадусаркай «Крамбамбулі». Сям'я жыве ў Фрунзэнскім раёне ў інтэрнацкай двухпакаёўцы. Лявон кажа, што «вузка, цесна, мала», але зважае, што бывае й горш. Як кожны вэтэран ВПС, марыць пра «запасны аэрадром»: прасторную хату дзе-небудзь у вёсцы, каб побач — лес, возера. Езьдзіць Лявон на «Mazda-323».

Дрэнных звычак амаль ня мае. Паліць зрэдчас — на розных застольлях, калі лягчэй паліць, чым не паліць. Апошні месяц алькаголю не спажывае наагул, пачаў нават на трэнажорах займацца. Горла любіць прамачыць добрай французскай мінэральнай вадой. Хоць у маразы ня супраць выпіць глінтвайну ды гарэліцы грамаў сто пад чырвоную рыбу (бр-р, толькі ня піва ўзімку!). Добра гатуе, але пра канкрэтныя ўпадабаньні не гаворыць. Маўляў, пры наяўнасьці часу можа згатаваць усё што заўгодна. Паводле адукацыі мастак, але малюе цяпер толькі «з нагоды» — калі трэба зрабіць камусьці падарунак. На жыццё асабліва не наракае.

## Піт



УЛАДЗІМЕР СКАМАРОШЧАНКА

Нарадзіўся 7 лістапада (Скарпіён). А зваць яго насамрэч Пятром. Асноўны занятак — гітара, акром іграньня ў шэрагу гуртоў дае прыватныя ўрокі. Спачатку вучыў бясплатна, але вучні прапускалі заняткі. Як прызначыў плату — дык чэргі стаялі. Жыццёвы прынцып: быць максымальна шчырым. Паводле ўласнага прызнаньня, занадта бурклівы, невыносны ў побыце ды яшчэ й выхваляка. Пры гэтым з жонкай, мастачкай Зояй Луцэвіч, жыве ўжо дзесяць гадоў. Праўда, шлюб грамадзянскі, бо ня хоча Піт падначальвацца «грамадзкім абрадам». Сыну Яну-Вінцэнту сем гадоў. Сям'я здымае двухпакаёўку на вул.Захарава. Ядуць у залі, бо ў кухні — хатняя музычная студыя. Затое маюць ажно дзьве машыны — «Ford Sierra» і «Audi». Праваў у Піта няма («лянота!»), таму машынай кіруе жонка. Піт ня п'е, ня паліць, займаецца спортам (плаваньнем, у прыватнасьці). Любіць мяса, перадусім сьвініну, засмажаную вялікімі кавалкамі. Антыалькагалік («Фу! Якая брыдота!»), аматар журавінавага напою. Служыў у паветрана-дэсантных войсках.

## Юрась



«МУЗЫКАЛЬНАЯ ГАЗЕТА»

Віншаваць з народзінамі 23 чэрвеня (Рак). Працуе старшым тэхнікам Інстытуту праблемаў ядравай фізікі БДУ. Адзіны з «энэрэмаўцаў», хто не служыў у войску: «адкасіў» у свой час. Абсалютна шчасьлівы ў шлюбе, з жонкай Дзінай разам пяць гадоў, дачцэ Яні — таксама пяць гадоў. Жывуць у трохпакаёўцы і таксама мараць пра «домік у дзярэўні» на паверхі два. Езьдзіць Юрась на звычайнай «сямёрцы». Упэўнена трымае ў руках і інструмэнты немузычныя. Любіць заняцца «хатнімі мужчынскімі справамі»: што-небудзь падправіць, зрабіць мэблю з нуля, паклясьці паркет, скруціць рэактар... Ніколі ня супраць спажыць дранікі са сьметанай. З напояў перавагу аддае каве, калі-нікалі гарэліцы. Мае сарамлівы характар, як і большасьць басістаў.

## Алезіс



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Дзень нараджэньня 7 лютага. Увогуле Вадаліў, але кажа, што няма яму адпаведнага знаку Задыяку. Жыве згодна з прынцыпам: як паставішся да іншых, так і яны паставяцца да цябе. Увесь час займаюць бубны й сям'я. Шмат сілаў ідзе на гадаваньне двухгадовае дачкі Паўліны. З жонкай Інгай жыве тры гады. Сям'я туліцца ў цеснай «хрушчоўцы» з дакладна не акрэсьленай колькасьцю пакояў. Як і Лявон, Алег скончыў мастацкую вучэльню. Пасьля былі танкавыя войскі. Алег з радасьцю «пажывіцца» сьвінінай і курацінай. З моцных напояў можа дазволіць сабе хіба разбаўленае віно, бо гадоў шэсьць таму з алькаголем завязаў. «І без аніякага кадзіраваньня, на ўласнай сіле волі», — хваліцца.

## Культура «NRM»

Збольшага «энэрэмаўцы» бавяцца лёгкім чытвом. Алезіс і Юрась любяць французскія дэтэктывы 50-х (П'ер Буалё, Наэль Калеф), Лявон адно толькі пасьпявае праглядаць газэты ды калі-нікалі пакорпацца ў Інтэрнэце («спакойнае існаваньне трэба мець, каб чытаць нешта сур'ёзнае»). Адзін Піт чытае ажно дзесяць кніг адразу: на палічцы ў яго ляжаць апошнія творы Пялевіна, Эка, Тацяны Талстой ды томік Караткевіча.

Што да візуальнага мастацтва, дык Алезіс разам з сваёй Паўлінкай цалкам занураны ў «саюзмультфільмаўскія» творы, Піт глядзіць усё: і кіно не для ўсіх, і расейскія «баевічухі». Юрась аддае перавагу лёгкаму кіно — клясычным вэстэрнам ды фільмам фармату тэлеканалу «ТВ-1000». Лявон упадабаў «Піратаў Карыбскага мора» — надта спадабалася гэтая атмасфэра, што вярнула яго ў дзіцячыя гады. «Мы з табой піраты беларускіх рэк», некалі сьпявала «Мроя». Ад «Настасьсі Слуцкай» уражаньні ў Лявона дваістыя.

Цікава, што найлепшыя айчынныя музыкі ня надта цікавяцца ўласна музыкай. Апошняе, што слухаў Юрась, быў трыб'ют «Viza NRM». Лявон асаблівых адкрыцьцяў за апошні час не зрабіў. Хіба што новы альбом «ZZ TOP» і гурт «Queens of the Stone Age». Піт любіць пераслухоўваць альбомы «Red Hot Chili Peppers», Стынга, Брэгавіча. Алезіс паважае цяжкую музыку, кшталту «System of Down» ды «Linkin Park».

## Дыскаграфія «NRM»

Група мае пяць студыйных альбомаў ды адзін канцэртны. Музыкі бралі ўдзел ва ўсіх супольных праектах (ад «Народнага альбому» да «Скрыпкі дрыгвы») і трыб'ютах («Песьнярок» і «Personal Depeche»). Першы альбом гурту звуўся «Lalala» (паводле загалоўнай песьні на вершы Міхала Анемпадыстава). Туды ўвайшлі песьні, напісаныя яшчэ за часамі «Мроі», але гэткая «грамадзянская лірыка» не пасавала новай эстэтыцы. «Одзірыдзідзіна», запісаная ўсьлед за «Lalala», прынесла гурту сапраўды масавую папулярнасьць: «Партызанская», «Мы самі па сабе», «Лепей ня будзе» прыйшліся вельмі дарэчы ў тыя «смутныя» часы. З «Одзірыдзідзінай» разьвілася ідэалёгія «NRM» як віртуальнай дзяржавы: музыкі падзялілі міжсобку «міністэрскія» паўнамоцтвы. Далейшымі альбомамі папулярнасьць «NRM» толькі замацоўвалася — «Пашпарт грамадзяніна NRM» прынёс адну з самых адметных айчынных рок-кампазыцыяў «Паветраны шар». Згаданыя альбомы запісваў Слава Корань. Менавіта ён знайшоў той фірмовы «энэрэмаўскі» гук. З «Трыма чарапахамі» гурт аб'ехаў усю Беларусь. Выхаду альбому папярэднічаў сынгл, ці, як назвалі «энэрэмаўцы», — «самотнік». Апошняя пакуль што праца гурту — «Дом культуры». Альбом быў выдадзены пры канцы 2002 г., разышоўся накладам каля 6000 асобнікаў і працягвае прадавацца.

## Палітыка «NRM»

Незалежная Рэспубліка Мроя была заснаваная ў 1994 г. на аснове супольнай «Мроі» бацькоў-заснавальнікаў. Ва ўрад рэспублікі ўвайшлі: Лявон Вольскі (гітара, вакал), Піт Паўлаў (сола-гітара, бэк-вакал), Юрась Ляўкоў (бас-гітара, бэк-вакал) і Алезіс Дзмідовіч (бубны). Лявон зьяўляецца міністрам працы й адпачынку, Піт займаецца пытаньнямі прапаганды, Юрась асвойтаўся на пасадзе міністра па барацьбе з карупцыяй і хабарніцтвам, Алезіс — адмысловец у сфэры турызму. Адразу ж па прыходзе на свае пасады кіраўніцтва «NRM» абвесьціла, што формай дзяржаўнага кіраваньня будзе ваяўнічая дэмакратыя, дзяржаўныя сымбалі — Герб і Сьцяг. У краіне пануе дзьвюхмоўе — беларуская-кірыліца і беларуская-лацінка. Кожны, хто хоча стацца грамадзянінам «NRM», мусіць запоўніць адпаведную заяву (можна знайсьці яе на сайце гурту www.nrm.by.com). Сярод асноўных дакумэнтаў гэтага ўтварэньня — Пашпарт грамадзяніна «NRM» (гл. аднайменны альбом) і Віза «NRM» (гл. аднайменны біс'ют).

**Сяргей Будкін**



«БДГ»

Піт і Лявон: боды-арт Зоі Луцэвіч да «Каранацыі-2000»



АРХІЎ ПІТА ПАЎЛАВА

Гэта гарбата



NRM.BY.COM

У гасьцях у мастака Лявона Тарасэвіча ў Валілах на Беласточчыне



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Рэпэтыцыя, люты 2004



«МУЗЫКАЛЬНАЯ ГАЗЕТА»

# Храналёгія «NRM»

**Пры канцы 1994**

«Мроя» ператвараецца ў «NRM». Над краінай у той час лунаў бел-чырвона-белы сьцяг, і вострасацыяльныя тэксты ды хард-рокавая эстэтыка былі ўжо ня ў модзе.



**12 студзеня 1995**

Правальны дэбют «NRM» на першай рок-каранацыі ў Альтэрнатыўным тэатры. Публіка не ўспрыняла «новай Мроі»: большасьць гледачоў на час выступу «NRM» разышлася. Рок-карону ўзяла «Крама».

**Лета 1995**

Дэбют «NRM» на «Басовішчы». Вольскі езьдзіў па справах прыватных у Францыю, таму заміж яго сьпявалі Піт і Юрась. Палякам вельмі спадабалася.




**Студзень 1996**

Песьня «Бывай» атрымлівае «рок-карону-1995» як найлепшы тэкст году. Яшчэ сьвежы ў памяці травеньскі рэфэрэндум.

**1996**

Запіс «Одзірыдзідзіны» — альбому, што прынес «NRM»




сапраўдную папулярнасьць. Падчас масавых шэсьцяў моладзь разам з патрыятычнымі гімнамі сьпявае «Партызанскую».

**Студзень 1997**

У часе «Рок-каранацыі» на песьню году намінавалі «Мела мамка тры сыночкі» — адзіную фальклёрную апрацоўку ў рэпэртуары «NRM». Музыкі прымаюць рашэньне граць на сцэне «Партызанскую» — сапраўдную песьню году. Пад націскам залі арганізатары прызнаюць яе найлепшай.



АРХІЎ М.АНЕМПАДЫСТАВА

**1997**

Шэраг канцэртаў «NRM» забараняюць. У Берасьці гэта адбываецца за дзьве гадзіны да пачатку. У Горадні «энэрэмаўцы» сыгралі пяць песьняў, пасьля чаго ва ўсім раёне зьнікла электрычнасьць. Падобныя сытуацыі і ў сталіцы.

**25 верасьня 1998**

Падчас канцэрту на філфаку БДУ ўпершыню зайграная песьня «Паветраны шар». Увогуле, 1998—99 г. можна назваць «залатым векам» «NRM». Выходзіць альбом «Пашпарт грамадзяніна




«NRM», у студзені 1998 г. гурту даюць галоўную «Рок-карону», «Паветраны шар» прызнаецца найлепшай песьняй 1999. Плюс — шалёны посьпех «Народнага альбому», дзе Лявон быў сярод «першых скрыпак».




**Лета 1999**

Шэраг непрыемнасьцяў з гарадзкімі ўладамі ў часе канцэртаў «Моладзь за незалежнасьць», «Рок-купальле», «Вольныя танцы». Забароны, сутычкі моладзі зь міліцыяй. Надзвычайнай жорсткасьцю быў адзначаны канцэрт 27 жніўня ў Маладэчне: без дай прычыны хапалі слухачоў, шмат каго моцна зьбілі. Кажуць, сытуацыю кантраляваў асабіста міністар унутраных справаў Сівакоў.

**Восень 1999 — вясна 2000**

«Польскі пэрыяд» у жыцьці «NRM»: канцэрты, праца ў студыі над дыскам «Тры чарапахі», выпуск сынглу. «Са-




мотнік» — гэта не назоў мініальбому. Пасьля лінгвістычных вышукаў «энэрэмаўцы» прыйшлі да высновы, што менавата так па-беларуску мусіць гучаць ангельскае слова «single».

**15 сакавіка 2000**

Канцэрт «NRM» і «Нэйра Дзюбелю» ў рамках акцыі «Марш свабоды».



СЯРГЕЙ КАЖАМЯКІН

**Лістапад 2000**

Двухтыднёвы тур па Беларусі ў падтрымку альбому «Тры чарапахі»: амаль кожны дзень — канцэрт у новым горадзе. Скрозь — аншлягі. Не абышлося без забаронаў. У Салігорску ўлады адмовіліся даваць залю мясцовага ДК. Дзе-нідзе адміністратары прасілі музыкаў, «каб не было палітыкі». Канцэрт у Магілёве запісвалі на відэа супрацоўнікі КДБ, прычым сакрэту з гэтага не рабілі. Яны ж затрымалі арганізатараў туру, у выніку чаго тыя не пасьпелі ў Віцебск. Сотні віцебскіх фанатаў «NRM» праз гэта не дачакаліся канцэрту.

**Студзень 2001**

На «Рок-каранацыі» ў КЗ «Менск» «NRM» перамагла ў асноўных намінацыях: музыка году — Лявон Вольскі, кліп — «Чыстая, сьветлая», песьня — «Тры чарапахі», альбом — «Тры чарапахі», тэксты году і галоўная рок-карона. За падзею году быў прызнаны праект «Я нарадзіўся тут», у якім «NRM» брала непасрэдны ўдзел.

**Ліпень 2001**

Адразу пасьля выступу на «Басовішчы» Алег Дземідовіч з сур'ёзнай траўмай галавы трапіў у беластоцкі шпіталь. Па дарозе ў гатэль яго зьбілі невядомыя. Празь некалькі дзён Алезіс разам з астатнімі музыкамі ўжо граў




на канцэрце ў падтрымку Сямёна Домаша.

**Канец 2002**

У музычным асяродку папаўзьлі чуткі аб распадзе «NRM»: Лявон скіраваў увагу на «Крамбамбулю» ды «Zet», Піт задумляў свае праекты. Як вынік пастаянных гастрольных турнэ, канцэрты сталіся падобныя адзін да аднаго. Але пры канцы сьнежня зьяўляецца новы альбом — «Дом культуры», які ўсе гэтыя чуткі развеяў. Сьцёб з постсавецкага мысьленьня ў альбоме развіўся ў цэлую п'есу — гумарэску пра спасьціжэньне сутнасьці Незалеж-




най Рэспублікі Мроі дырэктаркай Ёцавіцкага ДК.

**Восень 2003**

Выходзіць трыб'ют-прысьвячэньне «Viza «NRM». На ім некаторыя айчынныя выканаўцы (напрыклад, «Краскі») упершыню засьпявалі па-беларуску. Першы наклад дыску адразу ж разьмялі, у сувязі з чым арганізатары вырашылі выдаць другую частку трыб'юту.

**Люты 2004**

«NRM» сьвяткуе 10-годзьдзе канцэртам у КЗ «Менск» і выдае «бэставую» складанку «Справаздача 1994—2004». Дыск і рэпэртуар канцэрту-прэзэнтацыі складзеныя на падставе галасаваньня на сайце «NRM».

**Сяргей Будкін**

# Грамадзяне Рэспублікі Мроі

«Уладальнік дадзенага пашпарта знаходзіцца пад абаронай Незалежнае Рэспублікі Мроі». Такое права дэкляравана ў галоўным дакумэнце «NRM». Колькі грамадзянаў мае «дзяржава ў дзяржаве»? Паводле музычнага прадусара Віталя Супрановіча, на сёньня прададзена больш за палову трохтысячнага накладу трыб'юту «Віза «NRM», а блізу сотні дасланых «візаў» ужо падпісаны Лявонам Вольскім.

Фанаты «NRM» нераўнамерна расьсеяныя па тэрыторыі краіны. Найбольш іх, вядома, у Менску. У Пінску музыка гурту здолела памірыць спрадвечных ворагаў — нефармалаў і скіноў: і адны, і другія фанацеюць ад «NRM». У Баранавічах такой ідыліі няма. Наслухаўшыся «Трох чарапах» і «Лёгкіх», «энэрэмшчыкі», што тусуюцца на ПК тэкстыльшчыкаў, ідуць бамбіць «лысых» — «значыт, білі панкаў (ілі панкі білі нас)?» У Лідзе і Капылі прыхільнікаў «NRM» адзінкі. «Адкуль жа ім быць, калі навокал адна папса», — журацца апошнія з магіканаў.

Але чым даўжэйшы «канцэртны голад», тым прыемнейшая сустрэча зь любімымі музыкамі. Лявон расказвае, што ў Стоўпцах падчас раздачы аўтографаў фанаты ледзьве іх не зьмялі. Рэгіянальныя прыхільнікі больш неўтаймоўныя, кажа Вольскі, і пры гэтым яны «глыбейшыя» ў сваім успрыманьні музыкі. Аднак гэта — ня правіла. У менчукоў свой шарм: падчас аднаго з клюбных выступаў у Лявона ледзь ня скралі гітару. «Добра, што на выхадзе зладзеяў перахапілі. Гэта якраз і былі апантаныя фанаты: ведалі, што бралі», — кажа лідэр «NRM». Самыя ж эўрапейскія, інтэлігентныя фаны, на думку музыкаў, у Горадні.

Машыну Алега Дземідовіча раз спыніў даішнік. Але, дазнаўшыся, што парушальнік грае ў «NRM» на бубнах, адпусьціў і штрафу ня даў. Толькі гэта — унікум. Тыповы ж фэн «NRM» — маладзён 15—22 гадоў, які атрымлівае ці зьбіраецца атрымаць вышэйшую адукацыю. Вызначальнымі рысамі прыхільнікаў Вольскі назваў таксама свабодны сьветапогляд і беларускамоўнасьць. І трохі бурчыць: «У 17 гадоў яны фанацеюць з «NRM», а ў 20—22 знаходзяць працу ў дзяржаўных ці камэрцыйных установах і мяняюць свае густы згодна з тым». Але пазбаўляць «адыходнікаў» грамадзянства ніхто не зьбіраецца. Дый самі яны ня прагнуць яго пазбыцца. Дзявочая аўдыторыя больш трывалая. Яна перадусім фанацее з Вольскага і Паўлава — сэкс-сымбаляў гурту ды ахвотна адзываецца на іх прапановы зладзіць у часе канцэрту конкурс на самы лепшы бюст.

**Сяргей Трафілаў**



**На канцэрце ў Азёршчыне (Рэчыцкі раён, 2001) «NRM» запрасіла прыхільніц на сцэну для ўдзелу ў імправізаваным конкурсе на найпрыгажэйшы бюст. Справа дайшла да добраахвотнага стрыптызу.**

# Дзесяць песень

Мы з табой
адной
крыві

Месца для аўтографа

I трэба падняцца,
I цяжка стаяць.

Мы, беларусы, з братняю Русьсю
Шукалі да шчасьця дарог.
У бітвах за волю, ў бітвах за долю
Нас гэты шлях перамог.
Нас аб'яднала, ні многа ні мала, —
Удзел у дурной барацьбе.
Коласу слава, слава Купалу,
Але дзе месца тут для цябе?..



Згрызоты сумленьня,
Пакуты душы...
Маё пакаленьне —
Маё настальжы.
Твае сутарэньні,
Твае гаражы,
Сьпісаныя сьцены,
Жыцьцё на мяжы.

Нібыта нядаўна,
Нібыта даўно.
Састылая кава,
Дапіта віно.
Маё пакаленьне,
«Махая крылом,
Крывавую пішчу
Клюёт под окном».

Ці проста час
Зьмяняе сьвет,
Зьмяняе нас.

Растуць дамы
Пасьля дажджу.
Будуем мы
Сваю мяжу.
Будуем мы
Магутны мур,
Каб там схаваць
Сваю душу.

*Прыпеў:*
Лёгкія-лёгкія
Нашы далёкія.
Цяжкія-цяжкія
Блізкія нашыя.
Сьветлыя-сьветлыя
Нашы памерлыя.
Цёмныя-цёмныя
Нашы штодзённыя.



У сьветлым сьне
Ці ў цёмных днях
Сказалі мне,
Што ты — мая.
Ніхто нічый,
Усе — свае.
I кожны дбае пра сябе.

Нам ня трэба шмат казаць
I рабіць наадварот,
Нам ня трэба прадстаўляць
Свой заторганы народ.
Гэта наш з табою час,
Гэта наш з табою лёс.
Мы жывем апошні раз,
Мы жывем у поўны рост.

*Прыпеў.*



## Партызанская
**(рок-карона за найлепшую песьню 1996)**

Як прыходзілі к нам партызаны,
Гаманілі лясы і паляны.
Гаманілі лясы і паляны,
Як прыходзілі к нам партызаны.

Акупанты прыйшлі, ім імя — легіён,
Але нас не спыніць, але нас не стрымаць,
Відаць, што зноўку давядзецца адкапаць кулямёт,
Відаць, што зноўку давядзецца страляць.

*Прыпеў:*
Мы — партызаны,
Лясныя браты.
Мы — партызаны,
З вайной мы на «ты».

Мы — партызаны,
Любім наш край,
Ачысьцім свой край
Ад чужынскіх зграй.

I нашыя людзі, нібы павукі,
Распаўзуцца на ўсе на чатыры бакі
I будуць радзіму сваю вызваляць —
Страляць з-пад рукі, скідаць цягнікі.

*Прыпеў.*

А потым мы вып'ем з табой самагонкі
За нашыя пушчы, лясы і пагоркі,
За вольны наш край, за канец вайны.
Мы — партызаны, беларускія сыны.

*Прыпеў.*

## Песьня падземных жыхароў

Asus² Csus² Fsus² Dsus² Asus² Csus² Fsus² Dsus²
У нашай краіне ніколі ня ўзыдзе сонца,
Asus² Csus² Fsus² Dsus² Asus² Csus² Fsus² Dsus²
У нашай краіне ніколі ня ўзыдзе месяц.
Asus² Csus² Fsus² Dsus² Asus² Csus² Fsus² Dsus²
У нашай краіне ніколі ня бачна зораў,
Csu² Gsus² Fsus² Dsus² A C A C
У нашай краіне ніколі ня будзе сьвятла.



## Паветраны шар
**(рок-карона за найлепшую песьню 1999)**

G Am
О'кей! Тут усё о'кей.
Em D
Толькі дыхаць мне з кожным днём цяжэй.
G Am
Паветра зусім няма,
Em D
Колькі ні ўдыхай — усё дарма.

Asus²
Глядзець на брудны горад
Csus²
I крэмзаць мэмуары —
Em D
Ня варта вачэй і ня варта рук.
Asus²
I я гляджу на зоры,
Csus²
I я гляджу на хмары,
Em D
I слухаю ўласнага сэрца стук.



*Прыпеў:*
Em C
Падымі мяне
D Em
Па-над зямлёю,



Em C
Падымі мяне
D Em
Ў сьветлы абшар!
Em C
Падымі мяне
D Em
Над мітусьнёю.
Em C
Падымі мяне,
D Asus²
Паветраны шар!



Ляцець, над зямлёй ляцець,
Бачыць гарады, бачыць сто дарог.
Глядзець, на мяне глядзець
Сонным позіркам будзе мой народ.
На нешта выращацца
Прысьпеў, напэўна, час!
Паветрам свабоды дыхаю я.
Унізе — сям'я ды праца
I сто неадкладных спраў,
Якія сто разоў я адкладаў.

*Прыпеў.*

Няхай вы казалі мне
Пра няўдзячны лёс ды пра сумны фінал,
Але бачыў неба я,



Мая мэнтальнасьць — сэнтымэнтальнасьць.

А цяперашнія людзі пакідаюць свае гнёзды
I у вырай чарадою лятуць.
I я хацеў ляцець зь імі, але — сям'я і дзеці
Мне сказалі, што я буду сьвіньнёй.
А гэта значыць, што наперадзе восень.
На вочы рэзка навярнуліся сьлёзы,
Цябе я зноў абдымаю і плачу,
Цябе я зноў абдымаю і пла...

Мая мэнтальнасьць — сэнтымэнтальнасьць.

Раней былі такія сьвяты, што проста гамон:
Салют, шашлыкі і гарэлка,
I ўвесь народ увесь час абдымаўся і плакаў —
Ён плакаў ад захапленьня.
Магчыма, гэта не зусім эстэтычна,
Але згадзіцеся, як эратычна!
Я тры стагодзьдзі нічога ня бачу,
А ўсё цябе абдымаю і плачу.

## Лёгкія–лёгкія

Здымай сядло,
Гасі сьвятло.
Па плечы сьнегу намяло.
Ці то ня сьнег,

# Бывай

**(рок-карона за найлепшы тэкст 1995)**

Am G⁵ G♭⁵ F⁵
Нахіляецца долу невысокае неба,
Am G⁵ G♭⁵ F⁵
Нахіляецца долу, пахне шэрай імжой.
Dm C⁵ B B♭
Надыходзячы ранак пахне дымам і хлебам,
Am G⁵ G♭⁵ F⁵
Надыходзячы ранак пахне ўладай чужой.

*Прыпеў:*
Em F
Бывай, мой родны край!
G F
Бывай, мой родны горад!
Em F
Бывай, мой брыдкі брат!
G F
Бывай, мой любы вораг!

Нас хісталі арэлі, ды агні дагарэлі.
Нас хісталі арэлі ад вады да зямлі.
Мы ў люстэркі глядзелі, ды ня ведалі, дзе мы, —
На якой паралелі, на якім караблі.

*Прыпеў.*

Мой апошні тралейбус па праспэкце паедзе,
Загрукоча уночы мой апошні трамвай.

Маё пакаленьне
Расло на мяжы
З заслонай жалезнай
У самай душы.

Маё пакаленьне
Хаваецца ў цень,
У сьвет летуценьняў,
Ва ўчорашні дзень.
Маё пакаленьне
Гуляе і п'е,
Стаіць на каленях,
Ня любіць сябе.




Набыць бы даляры,
Прадаць бы рублі,
А потым — падалей
Ад гэтай зямлі.
«Мы — вольныя птицы,
Пора, брат. Пора» —
На стомленых крылах
У вырай ці ў рай.

Маё пакаленьне
Сядзіць пры стале,
Сядзіць у турме
І сядзіць на ігле.
Сядзіць на пасадзе
І любіць стагнаць:

І кожны сам
Сабе бальзам
На раны лье начной парой.
І мы глядзім
Бязглузды фільм,
Дзе кожны — сам сабе герой.

*Прыпеў.*

Было і ёсьць.
І наша злосьць —
Нібыта ў глытках нашых косьць.
Над намі страх,
Нібыта сьцяг.
І мы жывем, нібы ў гасьцях.
Зьбірай сяброў,
Запальвай газ.
Усё стагодзьдзе — дэкаданс.
Здымай сядло,
Гасі сьвятло.
Па плечы сьнегу намяло.




# Маё пакаленьне

Маё пакаленьне
У цемры расло.
Цяпер яму цемра —
Таксама сьвятло.

Да наступнай сустрэчы пройдзе пару стагодзьдзяў,
Пройдзе пару стагодзьдзяў, а пакуль што — бывай.

*Прыпеў.*

# Мітусьня

C D⁷
Мітусьня кароткіх дзён
C D⁷
Адыходзіць ў небыцьцё.
C D⁷
Нехта шле табе праклён
C D⁷
На усё тваё жыцьцё.




Зноў малююць абразы,
Над царквою ставяць крыж.
Прыкусіўшы свой язык,
Ты пакорліва маўчыш.

*Прыпеў:*
C G
Паглядзі, што вакол:
Dm F
Хто за кім, хто каго...
C G
Гэты сьвет — супраць нас,
F
Супраць нас.

# Мы самі па сабе

Я не хачу ведаць, што будзе заўтра.
Я уздымаю высока свой сьцяг.
Тое, што ёсьць, адбылося ня раптам,
Тое, што будзе, ня зьменіш ніяк.

Што трэба ведаць, каб потым ня схлусіць,
Каб не пакрыўдзіць самога сябе.
Дзе ўзяць уменьне уважліва слухаць,
Як не забрудзіцца у барацьбе.

*Прыпеў:*
Мы самі, мы самі, мы самі па сабе,
Мы самі — Маямі, Ямайка і Квэбэк.
Мы самі, мы самі, і ты нас не чапай,
Амэрыка, Эўропа, Індыя, Кітай.




Птушкі ня маюць прытулку у небе,
Людзі згубілі спакой назаўжды.
Пена марская заўсёды на грэбні,
А карабель не плыве без вады.

*Прыпеў.*

Не палюбіць мне чужую краіну,
Не зразумець мне варожых людзей,
І не пазьбегнуць удару у сьпіну,
І не праспаць гістарычных падзей.

*Прыпеў.*

7

Дыхаў небам я, неба я кранаў.

*Прыпеў.*

# Тры чарапахі

**(рок-карона за найлепшую песьню 2000)**

C G Am F
Калі раптам адчуеш камунальныя пахі
C G C
І жыцьцё цябе возьме ў пятлю,
C G Am F
Зразумееш тады, што тры чарапахі
C G C
Па-ранейшаму цягнуць зямлю.

Калі выйдзеш у горад ці залезеш у горы
І зь людзьмі усталюеш кантакт,
Зразумееш тады, што і сёньня, і ўчора
Наша месца — на трох кітах.

*Прыпеў:*
Хэй ла-ла-ла-лай,
Ты не чакай, сюрпрызаў ня будзе.
Хэй ла-ла-ла-лай,
Ты не чакай, ты не чакай.

Не было Галілея і Боба Марлея,

10

Не было Сальвадора Далі.
Ні Леніна, ні Ленана, ні Карла Лінэя —
А кіты й чарапахі былі.

*Прыпеў.*

Каб любіць Беларусь, нашу мілую маму,
Трэба ў розных краях пабываць.
Зразумееш тады — пад тваімі нагамі
Тры сланы нерухома стаяць.

*Прыпеў.*

Хэй ла-ла-ла-лай,
Ты не чакай, сюрпрызаў ня будзе.
Хэй ла-ла-ла-лай,
Ніхто не чакае, і ты не чакай.

# Мая мэнтальнасьць

Раней людзі былі не такія, як зараз,
А разы у два-тры пабуйней,
І надвор'е было не такое, як зараз,
А такое, што о-го-го-го!
І ўсяго было значна болей,
І птушкі былі як сабакі.
Як толькі я гэта ўсё прыгадаю,
Адразу плачу і цябе абдымаю.

11

*Прыпеў:*
Dsus² A#sus² Gsus²
Мы жывем пад зямлёю,
Dsus² A#sus² Gsus²
Мы жывем пад асфальтам,
Dsus² A#sus² F C
І нам з табою ня трэба
D A# F C
Літасьці і шкадаваньня.

Мы жывем пад зямлёю,
Мы — пацукі ды мышы.
Мы добра бачым у цемры,
Мы чуем кожны шолах.

У нашай краіне ня чутна ўрачыстых гімнаў,
У нашай краіне няма праграмы навінаў.
У нашай краіне ня трэба анкеты зь пячаткай,
У нашай краіне няма палымяных прамоў.

*Прыпеў.*

У нашай краіне няма бананаў ды ківі.
У нашай краіне няма рыпучага сьнегу.
А недзе наверсе над намі жыве краіна,
Там людзі жывуць, якія ня любяць нас.

*Прыпеў.*

6

# Народны гурт Беларусі

## Алег Клімаў: У дзясятачку!

Як бы я ні ставіўся да «NRM» у розныя гады — ад абыякавасьці, пасьля таго як на абломках «Мроі» ўзьнік новы калектыў; праз іранічна назіраньні за абагачэньнем каманды падлеткамі з марудным разумовым разьвіцьцём; да захапленьня падрыхтоўкай і рэалізацыяй альбому «Try čaгapachi» ды цяперашняга крытычнага рэалізму адносна апошніх навін з стану, — заўсёды ўсьведамляў, што «NRM» — Найвялікшы гурт у гісторыі беларускага року. Чаму? А ня ведаю, так выйшла, карма і зоры, Божанька прылашчыў. На ўзроўні падсьвядомасьці я перакананы ў гэтым 100-працэнтова, а канкрэтныя доказы ў чарговы раз прыводзіць лянота. Узгадаю толькі два.

Найлепшы рок-альбом з усяе нашай рокспадчыны ў цэлым — «Try čaгapachi». Перакананы, ён застанецца актуальным па-за кантэкстам любога часу, бо гэта — папросту Твор Мастацтва. І, акрамя таго (у канктэсьце), — сёньня гэта самая сумленная і чыстая работа з усіх магчымых чалавечых творчасьцяў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусі. Найлепшая беларуская рок-песьня — «Паветраны шар»: ня трэба асаблівых музычных наваротаў, вар'яцкіх аранжыровак і супэрглыбокага тэксту, каб прыдумаць Нятленку.

І эмоцыі. Багдановіч, Геніюш, Быкаў, Купала, Колас, Караткевіч, Мулявін, Адамовіч… самі дапоўніце мой адвольны шэраг дзеячоў культуры, у які я б ужо цяпер упісаў «NRM». Яны — Клясыкі. Яны ня тое каб заслужылі быць пры жыцьці вартымі такой «узнагароды» — іх месца ва ўяўным пантэоне Велічы арганічнае і адпавядае магчымым крытэрам для занясеньня ў яго.

Яны — сумленьне, настаўнікі, выхавальнікі, боль, праўда, трагедыя, надзея. Па іх зьвяраюць, зь імі параўноўваюць, пад іх працуюць, іх ненавідзяць, але да іх ня ставяцца абыякава. Можна зь іх пакепліваць, даваць высьпятка (за справу і ад уласнага нічогане-рабленьня), грэбліва крывіцца, знаходзіць плягіят і гэтаму радавацца, а потым, супакоіўшыся, рэзюмаваць — якая гэта ўсё фігня насамрэч. Гэта я — пры іх, а не яны — пры мне. Не было б побач такога заўсёднага раздражняльніка, каго б я гвазьдзіў? Адказваю — з ТАКІМІ любоўю і піетэтам да прадмета «нападак» — анікога. Сьвятое месца. І будзе такім і пасьля. Банальна, але любіць па-сапраўднаму заўсёды значна цяжэй, чым лавіць на недахопах, рэальных і ўяўных. Вось і ў мяне не заўсёды выходзіць. Суб'ектывізм — гэта цудоўна, адстароненасьць і г.д. Але быць аб'ектыўным — таксама карысная штука. Дык вось, аб'ектыўна тое, што мне пашчасьціла жыць у адзін час зь Лявонам Вольскім, Пітам Паўлавым, Алезісам Дземідовічам, Юрасём Ляўковым. І вам.

**Алег Клімаў** — галоўны рэдактар «Музыкальной газеты»

## Дзьмітры Падбярэскі: Вольскі — гэта Мулявін

Калі б Лявон Вольскі выйшаў на беларускую музычную сцэну пры канцы 60-х, ён бы першы, бадай, меў права назваць свой праект «Лявоны». Паралелі паміж асобамі Лявона Вольскага і Уладзімера Мулявіна вымалёўваюцца надзвычай выразна. Аж да таго, каб сказаць: Вольскі — гэта Мулявін сёньня.

Па-першае, абодва — безумоўныя лідэры. Першы рэпэртуар «Лявонаў» быў складзены з расейскамоўных вэрсіяў «Бітлз» ды досыць прымітыўных уласных песьняў дэкляратыўнага пляну («Лявоны»). Але на фоне тагачаснай эстрады і гэта глядзелася выклікам, асабліва ў Беларусі. Патрэбны былі ляўрэацкія месцы на конкурсах у Маскве, каб Мулявіна хоць крыху пакінулі ў спакоі, каб ён мог задумацца, якім быць «Песьнярам» надалей. Так ён прыйшоў да беларускай народнай песьні (расейскамоўная патрыётыка была збольшага ідэалягічнай індульгенцыяй).

Групу «Мроюю» я ўпершыню пачуў у 1983-м на сьвяце мастацтваў у Траецкім. Выглядалі музыкі так, як выглядаюць усе пачаткоўцы. «Мроя» запомнілася адным: беларускай мовай песень. Тады гэта было рэдкасьцю. Крыху беларускамоўных песень у рэпэртуары мела «Сузор'е» і было, вядома, на дзесяць галоў вышэй па майстэрстве. Аднак Валянцін Пучынскі «накаціў» у прэсе на «Мрою»: відавочна раўнаваў, як раўнавалі тыя, хто ў пачатку 70-х накінуўся на «Песьняроў» за нібыта спэкуляцыі на фальклёры. Бо на музычнай сцэне Беларусі зьявілася прынцыпова новая мадэль творчасьці. Хоць па музычнай мове «Мроя» знаходзілася зусім блізка да гард-року, які выконвала «Сузор'е». Канфлікт пакаленьняў? І гэта таксама.

Па-другое, як Мулявін з калегамі спапулярызаваў беларускую мову ва ўсім СССР, так і Вольскі з «мроеўцамі» давёў, што яна не чужая і куды больш жорсткай у параўнаньні зь «Песьнярамі» музыцы. Вольскі своечасова «тармазнуў» з народнай спадчынай, скіраваўшы ўвагу на аўтарскія песьні. Як і Мулявін, ён намацаў уласны напрамак, што дапамог «Мроі» не згубіцца сярод іншых.

Па-трэцяе, абодва маюць выразную харызму «зьбіральнікаў народаў». Мулявін адчуваў, якіх музыкаў і ў які час яму не стае ў калектыве. І як толькі пачаліся ў яго праблемы са здароўем, у «Песьнярах» паменшала яскравых асобаў. «Песьняры» заўсёды трымаліся на Мулявіну.

«Мроя» ўтрымалася дзякуючы, думаю, найперш Вольскаму. Адзінае, што было праблемай, — гэта пульт гітарыста. Замены на ім тлумачыліся прычынамі не музычнага, а хутчэй псіхалягічнага пляну. Але чатыры чалавекі «Мроі» — гэта не дзясятак і больш у «Песьняроў»: любы калектыў (творчы — найперш) колькасьцю звыш за сем чалавек набывае якасьці аўтамабіля без стырновай цягі. Мо таму і ўстаяла «Мроя» на чатырох колах, ня страціўшы тармазоў?

Па-чацьвёртае, Мулявін першы на беларускай эстрадзе выступіў як яскравая стылестваральная асоба. Унікальны стыль «Песьняроў» ён вынасіў і выкарміў. Хоць у сэнсе трыманьня стылістыкі Мулявін не такі пастаянны, як Вольскі. Гэты ў кожным з новых праектаў выступае ва ўласнай стылістыцы. Для мяне застаецца загадкай прычына зьмены назвы «Мроя» на «NRM». З музычнага боку істотных зьменаў не адбылося. Адбылася зьмена ідэйнай, іміджавай стылістыкі. Вольскі проста вывеў сябе і калег на новы віток раскруткі. Своечасова...

Па-пятае, Мулявін ці ня першы на савецкай музычнай сцэне сіламі аднаго калектыву перайшоў ад песеннай формы да больш значных, утварыў своеасаблівы тэатар песьні. А што Вольскі? А тое, што ўявіць безь яго «Народны альбом», «Сьвяты вечар», «Я нарадзіўся тут» складана. «Крамбамбулю» — немагчыма. Гаворачы пра тэатар песьні Мулявіна, мы гэтак жа пэўна можам казаць і пра тэатар Вольскага. Хіба што апошні вонкава больш сьмелы, правакацыйны.

Па-шостае, абодва маюць магутны ўплывовы патэнцыял. Прыкіньце, колькі гадоў Мулявін вызначаў музычную моду? Гэтак жа ўсе апошнія гады, пачынаючы ад зьяўленьня шыльды «NRM», праходзяць пад знакам безумоўнага ўплыву Вольскага. Тым ня менш Лявон застаецца цалкам даступнай фігурай. Ён, выходзячы з аўтамабіля, ніколі не адмовіць даць аўтограф. І ў Мулявіна, пакуль ён хадзіў пешкі па менскіх вуліцах, можна было вельмі проста разжыцца якім мэдыятарам.

Па-сёмае: і адзін, і другі напісалі песьні, якія назаўсёды застануцца ў гісторыі беларускай музыкі. Мулявінскія «Александрына», «Завушніцы», «Пагоня», «Чырвоная ружа». «Простыя словы», «Паветраны шар», «Лёгкія-лёгкія», «Маё пакаленьне» Вольскага.

Нарэшце, па-восьмае: ні спадару Лявону, ні спадару Ўладзімеру культ асобы не пагражае. Уладзімер Георгіевіч знаходзіцца там, дзе толькі сьвятыя маршыруюць. А Лявону Артуравічу адзін гэты артыкул мала што здольны дадаць да вобразу вялікага правадыра, мудрага настаўніка і айца рок-народаў.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Падчас канцэрту «Трыб'ют NRM»: песьні Вольскага сьпяваюць усе.**

## Ад Талачына да Астраўца

Шанцаў сустрэцца на вуліцах Барысава зь Беларушчынай вобмаль. Таму кожнае, хай і мінімальнае спатканьне ўспрымаецца зь вялікім энтузіязмам. Найбольшая імавернасьць гэткае сустрэчы — у музыцы. Людзі звыкліся напяваць любімыя мэлёдыі сабе пад нос, а іншы раз і ўголас. FM-станцыі прапаноўваюць спажыўцам Саладуху і «Ночных снайперов», называючы іх песьні «50% беларускай музыкі», а душа горнецца ўсё адно да свайго.

Цягаюся бяз мэты па рынку пасьля практыкі. Падыходзім з знаёмай да «кропкі» продажу касэтаў. І пакуль сяброўка набывае нейкі ультрасупэрмэгамодны альбом кшталту «Саюз-2003», я аглядаю паліцу: «Король и шут», Алсу, Міхаіл Круг etc. І тут позірк падае на вокладку знаёмага альбому. Так і ёсьць — «Try čaгapachi» і яшчэ тры NRMаўскія касэты. Нічога іншага беларускага не відаць. Пытаюся, ці карыстаюцца альбомы попытам. Гаспадар загадкава ўсьміхаецца і кажа: каб не раскуплялі-ся, не прадавалі б. А з «кропкавага» прыймача гучыць новы гіт Ларысы Грыбалёвай.

У каледжаўскім інтэрнаце ля старэнькага плэера раскідана мноства касэтаў расейскага ракапопсу. Бяру першую, што трапляе пад руку. Уключаю. З дынаміка ледзь чуваць: «Калі раптам адчуеш камунальныя пахі…» Запіс кепскі, дарэшты зацёрты неаднаразовымі перапісваньнямі.

Еду электрычкай у Менск. Побач сядзяць ці «рускаязычныя» хлапцы з Талачына. Мальцы вырашылі стварыць свой гурт, вось едуць у Менск набыць «людзкую» гітару, бо на старой няма ўжо магчымасьці граць. Адзін зь іх кажа, што дастаў новыя тэксты для выступаў. Падглядаю. Бачу раздрукаваныя тэксты «NRM» клясычным правапісам…

Дзень Волі-2003. Салігорск. Рэспубліканская алімпіяда па гісторыі Беларусі сярод сярэднеспэцыяльных установаў. Інтэрнат мясцовага пэдкаледжу. Астравецкі хлопец з бабруйскай мэдвучэльні, зважаючы на маю беларускую мову, падае навушнікі ад плэера з пытаньнем: «Гэткае слухаеш?» У навушніках гучыць «Одзірыдзідзіна»…

«NRM» за адносна кароткі час стала народным гуртом. Яскравы факт — з кім бы зь сяброў не пачынаў размову пра беларускую музыку, адразу чую: «А? NRM! Так!» Даючы каму-небудзь касэты гурту, ужо ведаю, што давядзецца дзень пры дні нагадваць, каб вярнулі. «NRM» ведаюць, слухаюць, прынамсі, пра іх чулі ўсе, нягледзячы на татальнае ігнараваньне іх песьняў FM-станцыямі.

Але найбольшая заслуга гурту за гэтыя дзесяць гадоў — папулярызацыя беларускай мовы. Пэўна, ніводзін палітык не зрабіў нічога падобнага. З год таму NRMаўцы ці ня дзьве гадзіны сядзелі ў жывым этэры «Первого музыкального». Маладзенькая журналістачка ўвесь час зьбівалася на беларускую мову, але ўпарта спрабавала трымацца расейскай. Піт Паўлаў прапанаваў: «А Вы размаўляйце па-беларуску». — «Не положено. У нас формат не тот!» — адрапартавала вядучая.

Нядаўна ў інтэрвію для радыё «Свабода» Алесь Матафонаў прызнаўся, што выбар мовы для перадачаў на ТБ — гэта справа ўнутранага цэнзара. «NRM» стаіць істотна вышэй за ўсіх гэтых нутраных і вонкавых цэнзараў: «русскоязычных» журналістак і рэдактараў «Музыкальной газеты», дзе інтэрвію з Вольскім і К° друкуюцца па-расейску, ды-джэяў FM-станцыяў, якія настойліва ня ставяць «NRM» на сваіх хвалях, сяброў журы, што адбіралі прэтэндэнтаў на Эўрабачаньне ды таропка зьнялі адзіную беларускамоўную кампазыцыю. Вось акурат за гэта мы і слухаем «NRM» — за іх гонар, шляхецтва ды шчырасьць — і пяём усёй нацыяй іх гіты.

Зь дзесяцігодзьдзем, Музыкі!

**Зьміцер Панкавец, Кастрыца (Барысаўшчына)**



Аляксандра і Канстанцін

PHOTO.BYMEDIA.NET

# Старт «Белабачаньня»

**Якую карысьць прынясе Беларусі конкурс на ўдзел у Эўрабачаньні? Такое пытаньне мне задалі ў тэлестудыі падчас выніковага галасаваньня нацыянальнага адборачнага туру. Я, безумоўна, пажартаваў, адказаўшы: «Аніякай». Сіламі дзяржтэлебачаньня, за дзяржаўныя грошы, зроблены першы крок у раскрутцы найлепшага з таго, што мы маем у папулярным жанры.**

Гэты крок многім раскрыў вочы: ёсьць у нас здольныя выканаўцы, якіх дагэтуль не жадалі ведаць на FM-каналах, ёсьць клясныя кампазытары і аранжавальнікі. Асобнае «брава» былому гітарысту «Новага неба» Леаніду Шырыну: у конкурсе прагучалі дзьве ягоныя песьні.

Конкурс паказаў і адваротны бок мэдаля. Зь пятнаццаці фіналістаў ніводзін не сьпяваў пабеларуску. Сытуацыю крыху ратуе тое, што ў ангельскамоўнай песьні «Мой Галілей» дуэту «Аляксандра і Канстанцін» маецца невялічкі фрагмэнт, дзе голас Аляксандры набывае народны каларыт.

Побач са мной у студыі знаходзілася пераможца ўкраінскага конкурсу Руслана. Лішне казаць — калі ёй далі час паказаць адну з сваіх песень, сьпявала яна па-ўкраінску. І я зусім не зьдзіўляюся, што яе апошні альбом, цалкам украінскамоўны, разышоўся накладам 170 тыс. асобнікаў! Для Беларусі гэта азначала б наклад прыблізна ў 35 тысячаў.

Абраны ў Беларусі спосаб вызначэньня пераможцы быў сумнеўным. Тэлегледачы, якім амаль палова канкурсантаў была наагул не знаёмая, галасавалі за тых, хто часта зьяўляецца на экране. Але сытуацыю «выратавала» тэхніка: лініі не вытрымлівалі такой колькасьці званкоў і самаблякаваліся, што дапамагло тым, за каго галасавалі не так інтэнсіўна: розьніца атрыманых галасоў у тэлефонным галасаваньні зьмікшавалася. Калі пераможцы — «Аляксандра і Канстанцін» — у суме атрымалі 2311 галасоў, Натальля Падольская — 2213, Максім Сапацькоў — 2119, Ірына Дарафеева — 2067, дык апошняя сума была ў 1920 галасоў. А вось галасаваньне ў Інтэрнэце правалілася: праз павуціньне выказаліся толькі 100 чалавек, прычым палова зь іх — за Падольскую.

Між тым сайт «Белтэлекаму» падаў вынікі галасаваньня, якія моцна розьняцца ад зьвестак Белтэлерадыёкампаніі: за «Аляксандру і Канстанціна» — 2260 званкоў, а за Натальлю Падольскую... 14506. У прэс-службе НДТРК кажуць: «Нашым афіцыйным партнэрам зьяўляецца не «Белтэлекам», а фірма «Тэлекам-інфа», якая вяла прыём званкоў. Афіцыйнымі зьвесткамі будуць лічыцца толькі лічбы Белтэлерадыёкампаніі». Начальніца ўпраўленьня маркетынгу «Белтэлекаму» Ларыса Спасава лічыць, што прычына рознагалосься ў лічбах мае тэхнічны характар: «Канал, якім карысталася «Тэлекам-інфа», вельмі малы, таму, мабыць, частка званкоў пайшла праз нас і адлюстравалася на нашым сайце. Магчыма, трэ было закрыць яго на час галасаваньня, але гэтай сытуацыі ніхто не прадугледжваў». Афіцыйных вынікаў «Белтэлекам» аспрэчваць не зьбіраецца. Затое гэта зьбіраецца зрабіць праз суд бацька Падольскай.

Ва Ўкраіне пераможцу вызначалі інакш: вялікае журы з спэцыялістаў выбірала паміж пяцьцю ўдзельнікамі, сярод якіх была і «Вія Гра», якая ўдзельнічае і ў расейскім адборы поруч зь Сярдзючкай.

Цяпер Аляксандру і Канстанціна чакае новае выпрабаваньне: яны мусяць трапіць у лік дзесяці найлепшых у першым, адборачным туры, у якім удзельнічаюць прадстаўнікі краін — дэбютантак «Эўрабачаньня».

**Дзьмітры Падбярэскі, АВ**

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Агляд-хроніка парушэньня правоў чалавека ў Беларусі ў 2003 годзе** / Праваабар. цэнтар «Вясна». — Менск, 2004. — 264 с.: іл.

Афіцыйна ліквідаваная «Вясна» выдала свой традыцыйны гадавік. Гэтым разам у сумнай хроніцы праваабаронцам давялося пісаць і пра сябе.

**Была вайна...: З гісторыі антысавецкага ўзброенага супраціву**. — Менск: Беларускі Рэзыстанс, 2003. — 40 с. 299 ас.

У брашуры сабраныя сьведчаньні жыхароў розных рэгіёнаў Беларусі пра антысавецкі рух у канцы 1940 — пачатку 1950-х. Апісаныя падзеі дазволілі Захару Шыбеку назваць гэты пэрыяд нацыянальнае гісторыі «нашай Чачэніяй». Пытайцеся на выставе ў ТБМ.

**Караткевіч У. Ладзьдзя роспачы:** Аповесьці. — Менск: Мастацкая літаратура, 2003. — 367 с.

Непераможны ў сваім жыцьцялюбстве Гервасій Выліваха й іншыя Караткевічавы героі з аповесьцяў «Ладзьдзя роспачы», «Дзікае паляваньне караля Стаха» ды «Сівая легенда» не губляюць прыцягальнасьці для чытача. Добра аформленае падарункавае выданьне (ілюстрацыі Арлена Кашкурэвіча) у «Сьветачы» каштуе 11580 руб.

**Карлюкевіч А. Ігуменскі блакнот:** Краязнаўчыя замалёўкі. — 2-е выд., выпраўл. і дап. — Менск: Выд-ц В.Хурсік, 2003. — 128 с. 300 ас.

Невялічкая зграбная кніга — унёсак у вывучэньне мінуўшчыны Ігуменскага павету (цяпер Чэрвеньскі раён). З гэтаю мясцовасьцю зьвязаная дзейнасьць Аляксандра Ельскага, Анатоля Бонч-Асмалоўскага, Аркадзя Моркаўкі ды інш. Мікрагісторыя — падмурак, на якім вырастае вялікая гісторыя краіны.

**Сохар Ю. Тэатральныя пуцявіны:** Мастацтвазн. арт., рэцэнзіі, творч. партрэты. — Менск: Тэхнапрынт, 2003. — 429 с.: іл. 400 ас.

У выданьні аналізуецца разьвіцьцё тэатральнага мастацтва Беларусі ў 1970—90-я. Асаблівую ўвагу аўтара прыцягнулі праблемы падрыхтоўкі акторскіх і рэжысэрскіх кадраў. Ладную частку кнігі займаюць рэцэнзіі на пастаноўкі твораў Кандрата Крапівы, А.Макаёнка, А.Петрашкевіча, ажыцьцёўленыя найбуйнейшымі беларускімі тэатрамі ў розныя часы. У жанры творчага партрэту распавядаецца пра А.Памазана, У.Няфёда й іншых беларускіх актораў, рэжысэраў, драматургаў.

**Чарнобыльская рана** / Уклад. М.Мятліцкага. — Менск: Літаратура й мастацтва, 2003. — 336 с. 3000 ас.

Чыноўнікі, навукоўцы, мэдыкі й журналісты разважаюць пра наступствы Чарнобылю. Амаль усе матэрыялы кнігі — пераклад расейскамоўных публікацыяў.

**Ярош М. Пясьняр роднай зямлі:** Жыцьцё й творчасьць Янкі Купалы. — 2-е выд. — Менск: Беларуская навука, 2003. — 341 с. 2500 ас.

**Анискевич Г. Жодино: История и современность.** — 2003.

Аўтар дае свой варыянт адказу на сакральнае пытаньне «З чаго пачынаецца Жодзіна?».

**Бондаренко К., Лавринович Д. Русские и белорусские монархисты в начале XX века** / Магіл. дзярж. ун-т імя А.Куляшова. — Магілёў, 2003. 500 ас.

Некалі пра фэномэн манархізму ў Беларусі пісаў А.Цьвікевіч. Потым гэтая тэма на доўгі час выпала з-пад увагі. Магілёўскія аўтары пасьлядоўна аналізуюць праграмы й колькасны склад правых партыяў — «Саюзу рускага народу», «Паўночна-Заходняга рускага веча», «Рускага ўскраіннага саюзу» і інш.

**Масленицына И., Богодяж Н. Радзивилы в эпоху интриг и авантюр**. — Менск: Трыёль, 2003. — 256 с.: іл. 5000 ас.

Аўтары пішуць даступна й папулярна, дый тэму абралі прывабную — Радзівілы на гістарычнай арэне Рэчы Паспалітай паміж наступам швэдаў і крывавай Паўночнай вайной. У драматычны час бескаралеўя, двухкаралеўя ды іншых пэрыпэтыяў. Зьяўленьне гэткіх гістарычных мініятураў — спроба на рэальным грунце стварыць для масавага чытача прыгожую, авантурную, запамінальную казку пра мінулае. Падчас напісаньня кнігі выкарыстана шмат польскамоўных крыніцаў. Цана ў «Акадэмкнізе» 4790 руб.

**Джоан К. Ролінг. Гаррі Поттер і орден Фенікса.** — Кіеў: А-ба-ба-га-ла-ма-га, 2003. — 816 с. Наклад не пазначаны.

Чарговы раман Джаан Ролінг выйшаў па-ўкраінску раней, чым па-расейску. Вельмі файны пераклад. Экалягічна чыстая фінская папера, адценьне якой падабрана так, каб вочы дзіцяці-чытача не стамляліся. Выдавецтва «А-ба-ба-га-ла-ма-га» вядомае сваімі сымпатычнымі дзіцячымі кніжкамі.

**Тацяна Вабішчэвіч, НБ**

## Барока Булгака

**Кнігарні Вільні прэзэнтавалі шыкоўны фаліянт — «Віленскае барока» са здымкамі Яна Булгака.** Ён выйшаў у рамках праграмы сьвяткаваньня 1000-годзьдзя Літвы пры дапамозе Міністэрства культуры і Польскага інстытуту ў Літве. На 144 старонках зьмешчаныя 90 здымкаў маэстра. Храмы, вуліцы, ужо няісныя ці моцна зьмененыя панарамы і куткі Вільні. Можна бясконца гартаць старонкі, спрабуючы пазнаць мясьціны, застылыя ў часе. Гэтыя здымкі аўтар рабіў цягам 1912—16 г. Яны суправаджаюцца камэнтарамі на літоўскай, ангельскай і польскай мовах. Так шкада, што няма беларускай...

**Дзяніс Раманюк, Вільня**

## Сто гадоў казачніку

**17 студзеня споўнілася сто гадоў з дня нараджэньня Алеся Якімовіча.** Бальшыня беларускіх казак, прачытаных намі ў дзяцінстве, — у яго апрацоўцы («Каваль Вернідуб», «Бацькаў скарб» і інш.). Складзены ім навучальны дапаможнік для 2-й клясы «Роднае слова» вытрымаў каля 30 перавыданьняў. Янка Маўр лічыў Якімовіча сваім настаўнікам. З нагоды юбілею 29 студзеня ў Доме літаратара адбылася вечарына.

## Купала і Колас у Варшаве

**Дзеячы польскае інтэлігенцыі прапануюць паставіць у Варшаве помнік Янку Купалу і Якубу Коласу.** Дзеля гэтага ствараецца грамадзкі камітэт, у які ўвойдуць публіцыст і перакладчык Яўгеніюш Кабац, сябры Польскага таварыства беларусістаў, супрацоўнікі катэдры беларусістыкі Варшаўскага ўнівэрсытэту і інш. Беларускае пасольства ладзіць кансультацыі па гэтым пытаньні зь дзяржустановамі й варшаўскімі ўладамі.

## Прэмія Акутагавы

**Самую прэстыжную літаратурную ўзнагароду Японіі — прэмію Акутагавы атрымала 20-гадовая Хітомі Канэхара за псыхалягічны раман «Зьмеі й завушніцы».** У 15 гадоў яна пакінула бацькоўскі дом і ня скончыла школы, з таго часу жыве зь сябрам. Мае фарбаваныя ў руды колер валасы, праколаты язык, з тузін завушніцаў у вушах, каляровыя кантактныя лінзы. Да таго ж зьбіраецца зрабіць сабе тату, як ейныя героі, — на знак пратэсту супраць абывацельскага ладу жыцьця.

## Пахаваньне Немэна

**Чэслава Немэна пахавалі 30 студзеня а 13-й на варшаўскіх могілках Павонзкі.** На пахаваньні было некалькі тысячаў чалавек. Радыёстанцыі ўсёй Польшчы — дзяржаўныя і камэрцыйныя — па-свойму ўшанавалі памяць музыкі: а 13-й на ўсіх радыёхвалях загучала песьня Немэна «Dziwny jest ten świat».

**АВ; БелаПАН, Gazeta.pl**

## ГАЗЭТНЫ ШАПІК




**Успаміны Сірыткі Маталяніна (сьв.пам. мітрапаліта Мікалая) зацікавяць усіх аматараў этнаграфіі і палескіх старажытнасьцяў.** Яны называюцца «Мотальскае вясельле» і ў дэталях, з тэкстамі рытуальных песень, апісваюць сакральныя рытуалы жыхароў гэтага мястэчка над Ясельдай. Друкуюцца запісы ў газэце «Беларускае слова», што выходзіць у Таронта (Канада). Газэты пакуль няма ў Інтэрнэце, але з выдаўцамі можна кантактаваць праз электронную пошту bielslova@hotmail.com

# Такое й жыцьцё, якая любоў

## «Барух-Эмануэль» у Купалаўскім



ВІКТАР СТРАЛКОЎСКІ

На сцэне зьлева направа: Раман Падаляка, Аляксандар Малчанаў, Павал Яскевіч

На малой сцэне Купалаўскага ідзе прэм’ерны спэктакль «Барух-Эмануэль». Гэта «маналёг» на тры асобы паводле Зьмітра Плаксы, пастаўлены Наталі Рынглер (Швэцыя) і Барысам Герлаванам (сцэнічнае афармленьне).

«Барух-Эмануэль» — спроба аб’яднаць у адной асобе Баруха Сьпінозу і Эмануэля Свэдэнборга. Спачатку гэтая асоба — думаньнік (Аляксандар Малчанаў), якога на шляху да ісьціны разьдзіраюць супярэчнасьці «стройных» філязофскіх тэорый. «Супярэчнасьці», што мрояцца герою ў выглядзе двух мужчын у чорных касьцюмах (Раман Падаляка, Павал Яскевіч), заганяюць філёзафа ў пастку, цытуючы яму ўрыўкі з тоўстых і ня вельмі фаліянтаў, раскіданых на падлозе.

Далей дзея разгортваецца ў лякарні для псыхічна хворых. У глыбокіх мэтафарычных разважаньнях псыхіятраў (тыя ж Падаляка і Яскевіч) можна пачуць адгалоскі Свэдэнборга і Сьпінозы. Дактары самі ў нечым падобныя да свайго пацыента, які Сьпіноза і Свэдэнборг адначасова...

Спэктакль насычаны філязофскімі разважаньнямі, глыбокімі і трапнымі мэтафарамі. У ім амаль няма пачуцьцяў, але яны «маюць пах». Спэктакль варта глядзець ужо дзеля адной фразы: «Чалавек мае такое жыцьцё, якую ён мае любоў».

**Каму глядзець.** Людзям з моцнай воляй.

**Калі глядзець.** Пасьля прачытаньня камэнтару ў праграмцы.

**Марыя Салаўёва**

МЕНСКАЯ КІНАПРЭМ’ЕРА

# «Развод» па-француску



WWW.MOVIEWEB.COM

Маладая дзяўчына Ізэбэл прыяжджае ў Парыж да сваёй сястры Роксі, якая нейкі час таму пакінула родную Санта-Барбару, выйшаўшы замуж за француза. Але замест шчасьлівай пары яна знаходзіць засмучаную сястру: яе палкі мужанёк акурат сустрэў дзяўчыну сваёй мары…

«Развод» — з шэрагу прыемных спакойных фільмаў, якія ні на што не прэтэндуюць, апроч таго як расказаць прыватную жыцьцёвую гісторыю. У цэнтры ўвагі — дзьве сям’і (француская і амэрыканская), таму ў карціне даволі многа пэрсанажаў, шмат дыялёгаў на дзьвюх мовах і багата сюжэтных адгалінаваньняў. Фільм, здаецца, здымаўся падчас амэрыкана-францускага процістаяньня на міжнароднай арэне, бо адрозьненьням у культуры і псыхалёгіі надаецца нямала ўвагі. Стужка сумеснай вытворчасьці, так што мы маем магчымасьць паглядзець на французаў вачыма амэрыканцаў і (у меншай ступені) на амэрыканцаў вачыма французаў. Апошнія выглядаюць ня надта сымпатычна: мала таго што кідаюць жонак на чацьвёртым месяцы цяжарнасьці, дык яшчэ: уціскаюць правы жанчын, у тым ліку ў шлюбным кодэксе; бессаромна кураць у прысутнасьці дзяцей і цяжарных; пазьбягаюць размоў пра грошы, але падчас разводу першым чынам дзеляць маёмасьць; лічаць дзівацтвам ужываньне цукрупяску. Ня трэба, зрэшты, думаць, што ўсе французы ў фільме намазаны адной чорнай фарбай, — ёсьць і станоўчыя пэрсанажы. Дый у амэрыканцаў трапляюцца дробныя недахопы. Уласна, якраз гэтая «гульня» на міжнацыянальных стэрэатыпах і падалася мне адным з найцікавейшых бакоў «Разводу».

**Іван Пятроў**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

### Беларуская дыскатэка

**10 лютага** ў клюбе «Тунэль» (пр.Пушкіна, 28) ладзіцца сьвяточная дыскатэка, прымеркаваная да Дня сьвятога Валянціна. Арганізатары абяцаюць цікавую праграму, віншаваньні й, вядома, найлепшую музыку. Аніякае расейскае папсы — толькі беларускія й заходнеэўрапейскія гіты. Прыходзьце зь сябрамі! Пачатак а 18-й. Уваход вольны.

### Юрась Жыгамонт

**7 лютага** а 15-й у кіналекцыйнай залі Менскага палацу дзяцей і моладзі (Старавіленскі тракт, 41) адбудзецца творчая сустрэча з акторам і вядоўцам тэлепраграмы «Падарожжа дылетанта» Юрасём Жыгамонтам. Уваход вольны.

### Хакейны выклік

**6—8 лютага** ў Менску будзе праходзіць IV этап міжнароднага турніру «Эўрапейскі хакейны выклік». Беларуская зборная мае згуляць з камандамі Польшчы, Вугоршчыны і Ўкраіны. Матчы будуць ужывую трансьлявацца на тэлеканале «Лад»: 6 лютага Беларусь—Польшча (18.25), 7 лютага Беларусь—Вугоршчына (18.25), 8 лютага Беларусь—Украіна (16.55).



PHOTO.BYMEDIA.NET

### Выстава «Пагоні»

З **29 студзеня** на вул.Макаёнка, 8 працуе выстава жывапісу «Яблыкі Сікоры», падрыхтаваная творчай суполкай «Пагоня». Аснову экспазыцыі склалі творы, што паўсталі падчас леташняга пленэру, праведзенага «пагонеўцамі» ў ваколіцах Шаркаўшчыны — у родных мясьцінах легендарнага беларускага сэлекцыянэра Івана Сікоры. Менавіта таму на выставе багата пэйзажаў, хаця ёсьць і партрэты (напрыклад, Я.Драздовіча) ды натурморты. Арганізатар мерапрыемства — Аляксей Марачкін. Доўжыцца выстава будзе два тыдні. Завітаць у галерэю можна штодня, акрамя нядзелі, з 9.00 да 17.00. Т.: 263-05-71.

### Вечарына Камоцкага і Паўлікавай

**12 лютага** а 18-й Дзяржаўны літаратурны музэй Янкі Купалы (вул.Янкі Купалы, 4) запрашае на сустрэчу зь Людмілай Паўлікавай і Алесем Камоцкім «Паэт і лямпада». Т.: 227-78-66. Уваход вольны.

### Вечарына і выстава Луцкевіча

Вечарына і выстава «Сейбіт добры, шчыры і сумленны» з нагоды 120-й гадавіны з дня нараджэньня Антона Луцкевіча адбудзецца **6 лютага** зусім рана, дарма што называецца вечарынай, — а 14-й гадзіне ў чытальнай залі архіву-музэю літаратуры і мастацтва (вул.Кірылы і Мятода 4).

### Гульня ў «Кронан»

**8 лютага** аматары гарадзенскае гісторыі й актыўных шпацыраў на сьвежым паветры зьбіраюцца разам, каб правесьці чарговую гульню «Кронан». Забаўка патрабуе ад удзельнікаў добрых ведаў мясцовае даўніны й някепскай фізычнай падрыхтоўкі. Рызыкантам за вызначаны час прапануецца выканаць дваццаць узаемазьвязаных заданьняў. Дзея адбываецца ўдзень у цэнтры Горадні. Ахвотныя паўдзельнічаць у «Кронане» мусяць сабраць каманду ды падаць заяўку на электронны адрас antyfa_gr@tut.by да 13 гадзін 7 лютага.

### Нашчадкі Шагала ў Бэльгіі

**З 11 да 22 лютага** ў будынку парлямэнту Валёніі (Бэльгія) можна будзе пабачыць выставу «Сучасны жывапіс Беларусі: нашчадкі Марка Шагала». Прэзэнтуе яе беларускае пасольства ў Бэльгіі.

**ТВ**

АФІША

### Авангарднае мастацтва

У Музэі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Скарыны, 47) працуе выстава Алега Крошкіна «Каляж». Выходныя — нядзеля, панядзелак. Т.: 288-24-68.

### Малая сусьветная выстава

Гэткую парадаксальную назву мае мастацкі праект швайцаркі Сюзаны Баўман, прэзэнтаваны ў Нацыянальным музэі гісторыі й культуры (вул.Маркса, 12). Выходны — серада. Т.: 227-06-33.

### Кітайскі жывапіс

Да 13-й гадавіны ўсталяваньня дыпляматычных адносінаў між Беларусяй і Кітаем прымеркаваная выстава «Сучасная кітайская акварэль», што адчынілася **31 студзеня** ў Нацыянальным музэі гісторыі й культуры. У экспазыцыі выстаўленыя творы 50 вядомых кітайскіх мастакоў.

### Лялькі

У Гасьцёўні Ўладзіслава Галубка (Траецкае прадмесьце) выстаўленая калекцыя лялек Беларускага дзяржаўнага тэатру лялек. Т.: 268-68-52.

### Батык

Да **14 лютага** ў Галерэі Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту культуры (Палац рэспублікі) дзейнічае выстава «Празрысты колер», дзе паказваюцца творы, выкананыя ў тэхніцы батык. Арганізатары экспазыцыі — сябры клюбу «Батык». Т.: 227-26-12.

### Опэра

**10 лютага** (аўт.) у Нацыянальным тэатры опэры — «Вясельле Фігара», опэра ў 4-х дзеях на музыку Моцарта. Квіткі — 3500—6000 руб. Т.: 234-10-41.

### Балет

**11 лютага** (сер.) «Страсьці (Рагнеда)», балет у 2-х дзеях, музыка Андрэя Мдзівані. Т.: 234-06-66.

### Граюць ляўрэаты

**10 лютага** (аўт.) у касьцёле Сьв.Роха (пр.Скарыны, 44а) ляўрэаты міжнародных конкурсаў А.Шышкоў (скрыпка) і У.Дулаў (фартэпіяна) выканаюць санаты Моцарта, Брамса й Бэтговэна. Т.: 284-44-33.

### Кінаафіша

***«Аўрора»*** (253-33-60)

«Анёлы Чарлі-2: толькі наперад» — **6 лютага** (пятн.) 16.40, 18.40, 20.40, **7, 8 лютага** (суб., нядз.) 14.40, 16.40, 18.40, 20.40.

«Вельмі страшнае кіно-3» — **6 лютага** (пятн.) 15.00, 17.00, 19.00, 21.00, **7, 8 лютага** (суб., нядз.) 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 21.00.

«Навагодні паштальён» (д) — **6 лютага** (пятн.) 14.30, **7, 8 лютага** (суб., нядз.) 12.30.

***«Бярэсьце»*** (272-87-91)

«Падвойны фарсаж» — **6—8 лютага** (пятн.—нядз.) 16.30, 18.00, 18.40, 21.00.

«Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончаная» — **7, 8 лютага** (суб., нядз.) 13.00 (л), 14.50.

«Настасься Слуцкая» (д) — **6 лютага** (пятн.) 13.00.

«Ледавіковы пэрыяд» (д) — **7, 8 лютага** (суб., нядз.) 11.30.

***«Кастрычнік»*** (232-93-25)

«Валадар пярсьцёнкаў: Вяртаньне караля» — **6 лютага** (пятн.) 16.10, 20.00, **7, 8 лютага** (суб., нядз.) 12.20 (л), 16.10, 20.00.

***«Масква»*** (223-14-48)

«Валадар пярсьцёнкаў: Вяртаньне караля» — **6 лютага** (пятн.) 16.20, 20.00, **7 лютага** (суб.) 12.40, 16.20, 20.00, **8 лютага** (суб.) 12.40 (л), 16.20, 20.00.

***«Мір»*** (284-37-71)

«Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончаная» — **6 лютага** (пятн.) 17.00, **7, 8 лютага** (суб., нядз.) 15.00, 17.00.

«Развод» — **6–8 лютага** (пятн.—нядз.) 19.00, 21.10.

«Брус Усёмагутны» — **6 лютага** (пятн.) 18.10, 20.20, **7, 8 лютага** (суб., нядз.) 16.00, 18.10, 20.20.

***«Перамога»*** (223-77-66)

«Рэальнае каханьне» — **6 лютага** (пятн.) 13.30, 16.00, 18.30, **7–8 лютага** (суб., нядз.) 13.30, 16.00 (л).

«Летуценьнікі» — эксклюзіўны паказ фільму Б.Бэрталючы, **6 лютага** (пятн.) 21.00, **7, 8 лютага** (суб., нядз.) 18.40, 21.00.

***«Цэнтральны»*** (220-34-16)

«Лара Крофт — раскрадальніца грабніц-2: калыска жыцьця» — **6 лютага** (пятн.) 11.30, 13.50, 16.10, **7, 8 лютага** (суб., нядз.) 11.30, 16.10.

«Забіць Біла» — **6 лютага** (пятн.) 18.40, 21.00, **7, 8 лютага** (суб., нядз.) 13.50 (л), 18.40, 21.00.

**Тацяна Вабішчэвіч**

# Памылка Князева

**Рэктар Акадэміі кіраваньня Станіслаў Князеў у «Беларуси сегодня» не знайшоў лепшага аргумэнту ў падмацаваньне сваіх ідэалягічных дактрынаў, як абаперціся на спадчыну беларускіх пісьменьнікаў:** «Нягледзячы на старадаўнюю гісторыю, беларускі народ зьвязваў сваё нацыянальнае адраджэньне й станаўленьне менавіта з савецкім пэрыядам жыцьця. Пра гэта кажа творчасьць усіх без вынятку беларускіх пісьменьнікаў першай паловы XX ст.».

Творчасьць пісьменьнікаў можна прачытваць па-рознаму. Калі захацець, можна і Быкава дэклямаваць вершамі, і ў Багдановіча знайсьці падтрымку СССР. Цяжка па-рознаму прачытваць біяграфіі. А яны ў трох чвэрцяў «беларускіх пісьменьнікаў першай паловы XX ст.» сканчаюцца адным годам: 1937. Вось так, спадару Князеў.

**Алесь Касьцян, Менск**

# З Богам у галаве і беларускай душой у сэрцы

**Днямі пайшоў да паштовай скрынкі ўзяць сваю любімую газэту, а разам зь ёй мне ў рукі трапіў каляндарык ад спадара Статкевіча.** Усё б нічога, але каляндарык амаль цалкам расейскамоўны. Спадару Міколу, напэўна, так лягчэй, але я ведаў яго ў лепшыя часы і ганаруся тым, што адным зь першых прысягнуў на вернасьць Бацькаўшчыне. Гэты каляндарык падштурхнуў напісаць пра тое, ад чаго баліць душа.

Мне баліць, калі немагчыма вывучыць сваіх дзетак па-беларуску. Калі дачка прыходзіць са школы і з задавальненьнем кажа, што ў яе палепшыліся адзнакі па гісторыі Беларусі, таму што яе сталі выкладаць па-расейску. Калі блізкі чалавек, які падштурхнуў мяне да беларускае мовы, сам яе нішчыць. Калі па тэлебачаньні раздаюць узнагароды за адраджэньне нацыянальнай культуры, але ні нашай мовы, ні нашай культуры не чуваць. Калі я бачу маладога чалавека, што шпацыруе па горадзе са свастыкай на рукаве і з эсэсаўскімі маланкамі на барэтцы. Калі я бачу назвы крамаў «Криница», «Чаровница». Калі ў царкве моляцца на чужынскай мове. Няўжо яны ня ведаюць, што Бог даў кожнаму народу мову і, каб малітва дайшла, трэба маліцца на божай мове.

Але ж я аптыміст па характары, і, калі ў краме маладая гожая дзяўчына, дазнаўшыся, што я не настаўнік, кажа, што «вы класна размаўляеце», і адказвае мне па-беларуску, калі я падвожу людзей, якія, пачуўшы, што я за «спасибо» не падвожу, а пад’ехаць са мной можна толькі за «дзякуй», дабаўляюць слова «вялікі», я разумею, што сапраўды Беларусь жыве з Богам у галаве і беларускай душой у сэрцы. А хвароба — на тое і хвароба, каб яе лячыць, і мой боль таксама часовы. Спадары, выціскайце зь сябе па кроплі ўсё халуйскае і скажыце ўрэшце першыя свае беларускія словы «дзякуй» і «калі ласка». Вучыцеся, як вучыцца немаўлятка казаць слова «мама» ці «тата».

**Генадзь Шэпелеў, Барань**

# Дэпутат Зінчанка, памятайце...

**Прашу надрукаваць пытаньні, якія я адрасаваў дэпутату палаты прадстаўнікоў ад Пружанскай выбарчай акругі Аляксандру Зінчанку.**

Грамадзянін А.Зінчанка, памятаеце, 10 кастрычніка 2002 г. Вы прыяжджалі ў «родныя» Пружаны для сустрэчы з выбарцамі. Я прыйшоў з шэрагам пісьмова падрыхтаваных пытаньняў. Вы паабяцалі не пазьней як у дзесяцідзённы тэрмін пісьмова адказаць. Я вельмі цярпліва чакаў, але так і не дачакаў. Вас народ выбраў для таго, каб Вы пісалі свайму народу такія законы, якія б абаранялі кожнага беларуса ў яго краіне. І галоўнае — каб заўсёды памяталі, што Вы асабіста жывяце за кошт падаткаплатнікаў.

Вось тыя пытаньні:

1. Пасьля выбуху на Чарнобыльскай АЭС быў загад з Масквы паднятыя ў паветра радыенукліды асадзіць на тэрыторыі Беларусі, што і было зроблена пры дапамозе спэцыяльных сродкаў-абсарбэнтаў ды авіяцыі. Чаму Вы не дамагаецеся расьсьледаваньня гэтага адкрытага тэрарызму супраць сваёй дзяржавы і кампэнсацыі за яго?

2. Якую суму грошай беларускія падаткаплатнікі плацяць сем’ям амэрыканскіх спартсмэнаў-паветраплавальнікаў, шар якіх быў зьбіты на нашай тэрыторыі?

3. На адлегласьці трыццаці крокаў ад рэчкі Пружанкі і ня болей як дзесяць крокаў ад жыльлёвых будынкаў узьведзена каля трохсот аўтамабільных гаражоў. Хто павінен адказаць? Рака забруджаная, перад пад’ездамі бесьперапынна шмыгаюць аўтамабілі, з кватэры ня можа выйсьці ні малы, ні стары.

4. Чаму нашая дзяржаўная мяжа ахоўваецца толькі з Захаду, а з Усходу не? Штогод сотні тысяч вандроўнікаў-нелегалаў наплываюць у нашую невялікую краіну. Усё гэта беларускаму падаткаплатніку абыходзіцца ня толькі ў суму грошай, але і ў найвялікшую небясьпеку жыцьцю.

5. Мае два дзяды, бацька пралілі шмат крыві, а шасьцёра дзядзькоў наагул загінулі ў вайне зь нямецкімі захопнікамі. Ім палітрукі абяцалі пасьля перамогі заможнае райскае жыцьцё, і яны перамаглі. А ўжо ў 1948 г. гэтыя ж палітрукі-бандыты ў бацькі адабралі зямлю, жывёлу, разбурылі гаспадарчыя пабудовы і бацьку майго рэпрэсавалі. Дык чаму цяпер, калі наша краіна Беларусь пазбавілася каляніяльнай залежнасьці ад Расеі, калі мы сапраўды вольны народ, я ня маю права на бацькаву спадчыну, якую ён здабыў сумленна, потам і крывёй?

Спадзяюся, Вы ня будзеце балятавацца на трэці дэпутацкі тэрмін, ня выканаўшы сваіх абяцаньняў за мінулыя дзесяць гадоў.

**Ваш выбарца Мікола Жук, Пружаны**

# Дзіцячыя забавы

**Заехаў у госьці да пляменьніка.** У ягонай жонкі юбілей. Сабралася застольле — сябры, сваякі, суседзі. У другім пакоі сумуе Волька, суседзкая дзяўчынка трох гадоў. Маё зьяўленьне выклікае яе ажыўленьне. Я падсаджваюся да яе на канапу, і мы пачынаем дурэць — кідацца падушачкамі, валікамі. «Зараз я цябе закапаю», — кажа яна, перакульвае мяне на канапу і накідвае наверх усе падушкі і валікі. Я ляжу, не падаючы прыметаў жыцьця. «Ты што?» — зьдзіўлена пытаецца. «Закопваюць жа мёртвых, — тлумачу я. — Раз ты мяне закапала, значыць, я памёр». — «А як цябе ажывіць?» — «Пацалункам». Яна нахіляецца і цалуе ў вусны. І тут прыйшла пара зьдзіўляцца мне: гэта быў не бязгрэшны пацалунак дзіцяці, гэта быў прафэсійны пацалунак гейшы. Яна нават язычком павадзіла па маіх вуснах. Цікаўлюся: «Дзе ты навучылася так цалавацца?» — «Па тэлевізары». — «Ты што, і з татам, з мамай так цалуешся?» — «Не». — «А з кім?» — «Зь Сярожам». — «Гэта хто?» — «Ай, у нас у садзіку». Мяне клічуць за стол, і я пакідаю новую знаёмую.

Празь некаторы час частка мужчын вырашае зрабіць перакур, і на канапе, дзе мы сядзелі за сталом, застаюся толькі я. Волька прабіраецца да мяне цераз маміны і татавы каленкі. «Дзядуля, падымі мяне». Я падымаю яе на выцягнутых руках і кручу ў адзін, другі бок. Ёй гэта падабаецца, яна раскідвае рукі і «лётае» над намі, залівіста сьмеючыся. Апускаю. Яна абдымае мяне за шыю і шэпча: «Дзядуля, а цяпер давай паляжым». Я адхіляюся на сьпінку канапы. «Не, ня так, — абураецца яна маёй нездагадлівасьці. — Давай паляжым па-сапраўднаму». — «Як гэта па-сапраўднаму?» — насьцярожваюся я, помнячы той пацалунак. «Ну, ты кладзіся!» — гаворыць яна тонам, якім выхавальніца размаўляе зь някемлівым хлапчуком. Я кладуся на канапу. «Не, ты і ногі пакладзі!» Яна кладзецца разам са мной, абдымае мяне, я абдымаю яе, яна закідвае сваю нагу на мой жывот і пачынае выгінацца ўсім целам, імітуючы жарсныя жаночыя ласкі. Потым прытуляецца да мяне і зноў цалуе ў вусны пацалункам гейшы. Я запытальна азіраюся на бацькоў гэтай «німфэткі», што сядзяць побач і назіраюць за нашай гульнёй. Маці разгублена тлумачыць: «Наглядзяцца такіх сцэн у тэлевізары, вось і пераймаюць...» — «Яна што, начамі тэлевізар глядзіць?» — «Чаго начамі? Цяпер гэтага і днём хапае. Выхавацелькі ў садзіку глядзяць сэрыялы, вось і яны зь імі...»

Вось так! Мы абмяркоўваем праблему сэксуальнага выхаваньня ў школе, спрачаемся аб эротыцы як зьяве мастацтва. А пакуль мы абмяркоўваем і спрачаемся, праблема паступова «маладзее» і вось — ужо пранікла ў дзіцячы садок! Цяпер для дзяўчынкі ўсё гэта — толькі гульня, імітацыя падгледжанага ёю і яшчэ не ўсьвядомленага дарослага жыцьця. Але — гадоў праз дзесяць (крый Божа!) адзін такі пацалунак зь нейкім Сярожам можа абярнуцца вялікай драмай усяго яе далейшага жыцьця.

Забароны толькі абвастраюць цікавасьць. І ў выніку забароны дзіця будзе рабіць тое ж, толькі тоячыся ад тых, хто забараняе. На мой погляд, словы «кепска, брыдка, агідна» ў такіх выпадках нельга выкарыстоўваць, бо дзіця можа зразумець вялікую і чароўную зьяву каханьня як нешта непрыстойнае, бруднае. І не заўважаць — таксама ня выйсьце. Маўляў, падрасьце — зразумее. Пакуль зразумее, можа аказацца позна. Бо зразумець дапаможа той самы Сярожа, калі крыху сам падрасьце. «Тлумачоў» вакол дзіцяці хапае. Галоўны зь іх — той самы тэлевізар, сёньняшніх гаспадароў якога ня вельмі турбуюць такія праблемы.

Застаецца тлумачыць самім, тлумачыць далікатна, тактоўна і абачліва. Тлумачыць ужо ў такіх гадах. Размова зь дзецьмі на гэтую тэму — вялікае мастацтва, якім мала хто сёньня валодае нават сярод пэдагогаў. Але авалодаць гэтым мастацтвам цяпер становіцца неабходнасьцю для кожнага бацькі і кожнай маці. І ад таго, авалодаем мы гэтым мастацтвам ці не, залежыць лёс многіх Волек і Сярожаў.

**Міхась Калясянец, Магілёў**

# Зьдзек з хворых

**Каб здаць аналіз крыві, трэба гадзіну чаргі выстаяць хвораму чалавеку!** Якое тут лячэньне, якая карысьць? Гэта ж сам сабе скажаш — лепш у тую паліклініку не пападацца! Узяць талён да хірурга — тэлефануй гадзіну. Трапіць на прыём з талёнам — стой паўтары гадзіны. І гэта ж так усюды, куды ні ткніся. Што гэта за сыстэма, што за краіна! А ва ўсім вінаваты Лукашэнка. Так, так, гэта ён такую сыстэму аберагае, захоўвае, не дае нічога памяняць. Яму што! Насупраць цэлы квартал прэзыдэнцкай лечкамісіі — апанаваў! А як быць нам, каго да лечкамісіі не падпусьцяць?

**Ніна Палейчык, Менск**

## ВОДГУКІ

# Не «Гербалайф»

**У №1 «НН» за 9 студзеня на старонцы 4 мімаходзь быў закрануты сеткавы маркетынг ды прыватна кампанія NSP.** Аўтар, мабыць, гэтаксама адно мімаходзь чуў пра дзейнасьць вышэйзгаданае кампаніі. «Nature’s Sunshine Products» зьяўляецца сусьветным лідэрам у вытворчасьці ды рэалізацыі БАДаў — біялягічна актыўных дадаткаў да ежы, выключна з прыроднай сыравіны.

Што да самога сеткавага маркетынгу, гэта ёсьць на сёньня найбольш прагрэсіўная мадэль бізнэсу. У ЗША цяпер блізу 40% прадукцыі рэалізуецца праз сеткі дыстрыбутараў — прадстаўнікоў сеткавых кампаніяў. Хіба што ня ўсе кампаніі прафэсійна ды шчыра робяць сваю справу. Шмат нэгатыву выклікае «Гербалайф», бізнэс якога не адаптаваны да эканамічна-сацыяльных варункаў краінаў СНД, чаго ня скажаш пра варункі бізнэсу NSP. На жаль, бальшыня нашага насельніцтва ўсё яшчэ хварэе на саўковае непрыманьне ўсялякіх зьменаў, хай нават да лепшага. Ну хіба не бязглуздзіца кшталту — ён ня ведае шчэ, пра што размова, а ўжо: «...а, гэта ж такая хрэнь, як «Гербалайф»!» — пры тым, што нават пра няшчасны гэты «Гербалайф» ён чуў нешта неяк ад некага... Калі ён уважае, што ўсе за цяперашнім часам радыя гібець на сваёй «стабільнай працы» ды атрымліваць за яе гэткі «стабільны заробак», ён дужа памыляецца. Ёсьць і ў нас людзі, гатовыя апантана працаваць, а не рабіць выгляд, ды атрымліваць за тое грошы, а ня сьлёзы. Яны ня будуць месяцамі падпіраць сьцены цэнтру занятасьці, абіваць розныя парогі ды шукаць «падвязкі», наракаючы за чаркай на гаротны лёс... Трэба адно як сьлед зажадаць ды не ленавацца.

Я паводле адукацыі пэдагог, мне падабалася рабіць у школцы (у пляне жывых зносінаў з вучнямі, калегамі), але наша школьная сыстэма вымагае ад сьведамага беларуса проста шалёных маральных высілкаў ды хутка зьнявечанага здароўя. Давялося кідаць школку, шукаць нешта іншае; неўзабаве я сутыкнуўся з кампаніяй NSP. Я зразумеў, што гэта маё, тут я магу ўдасканаліць і сябе, а таксама несьці пэўную карысьць людзтву. А гэта ўсё, што мне трэба.

**Зьмітрусь Бабровец, Менск**

* * *

**Шаноўныя калегі!** Прапаную вам падказку да міністэрскіх гадоў нараджэньня (хоць прынцыпова ў вашых разьліках гэта нічога не мяняе). Няма ў мяне пакуль толькі міністра энэргетыкі, прызначанага нядаўна. Дык вось: Русецкі — 1951, Пастаялка — 1941, Зайчанка — 1948, Белахвостаў — 1949.

З найлепшымі зычэньнямі,

**Валянціна Трыгубовіч, Менск**

# Чарот — не трысьнёг

**У артыкуле «Грошы зь ветру» аўтарка некалькі разоў блытае назву расьліны, зь якой робяць пліты.** У адным месцы называе яе чаротам, у другім — трысьнягом. Гэтыя расьліны адносяцца да розных сямействаў: чароты *Scirpus spp.* — да асокавых *Cyperaceae*, а трысьнёг звычайны *Phragmites communis* — да злакаў *Gramineae*. Пераводзячы дадзены прыклад на людзей, гэта ня толькі пераблытаць прозьвішчы, але ў адным месцы напісаць пра чалавека, а ў другім тую ж асобу назваць мартышкай (прадстаўнічкай іншай сям’і атраду прыматаў). Мне здаецца, што любы б пакрыўдзіўся за такі палёт фантазіі. Але расьліны ня крыўдзяцца?

У другім артыкуле гэтай жа аўтаркі «Курорт і нацпарк...» чытаем, што «стварэньне нацпарку зробіць магчымай гаспадарчую дзейнасьць у лесе (высечкі)...» Калі б толькі ў нацпарках былі магчымыя высечкі і іншая гаспадарчая дзейнасьць, дык навошта ствараліся б леспрамгасы — лясныя прамысловыя гаспадаркі? Калі ж гаворка ідзе пад пераход зямлі і ўсяго, што на ёй, у якасьці Нацпарку пад непасрэдную ўладу Кіраўніцтва справаў Лукашэнкі, дык гэта зусім іншая гісторыя.

Разумею, што, як піша ў гэтым жа нумары Віталь Тарас, «амаль кожны з журналістаў» займаецца «верхаглядзтвам». Але ўсё ж гэтыя матэрыялы быў час падрыхтаваць лепш.

**Дзьмітры Вінчэўскі, tut.by**

# Вандэйцы — гэта сьвядомыя беларусы

**Напісаць да Вас мяне вымусіў артыкул Вацлава Шаблінскага «Вандэя і Алесь Адамовіч», апублікаваны ў «НН» №2.**

З большасьцю тэзаў, выказаных у гэтым артыкуле, я не магу пагадзіцца. І называючы Беларусь Вандэяй, А.Адамовіч меў на ўвазе краіну, якая не зьбіраецца станавіцца на шлях эканамічных і сацыяльных пераўтварэньняў, краіну, якая зрабілася апірышчам рэакцыі на тэрыторыі ўсяго былога СССР. Ці ж нагадвае Вандэя канца XVIII ст. Беларусь часоў перабудовы?

Прапаную зірнуць на этнічную мапу сучаснай Францыі. Дзе народы, якія яшчэ ў XVIII ст. існавалі ў гэтай краіне? Дзе правансальцы? Дзе вядомыя з кніг А.Дзюма гасконцы? Усе яны, як пісаў сацыяльны псыхоляг XIX ст. Гюстаў лё Бон, «згарэлі ў полымі Вялікай француcкай рэвалюцыі». А вандэйцы (брэтонцы)? Яны і сёньня жывуць на сваёй этнічнай тэрыторыі. Размаўляюць на сваёй старажытнай мове. Нягледзячы на страты, брэтонцы здолелі захаваць сябе як народ. І ўсё таму, што ў свой час яны не паверылі ўтапічным лёзунгам, кінутым у натоўп парыскімі імпэрыялістамі. Не аддалі сваю нацыянальную інтэлігенцыю ў пашчу імпэрскаму Малоху.

Дык каго ж у Беларусі можна назваць вандэйцамі? А гэта мы — сьвядомыя беларусы!

**Сяржук Пятровіч, Барысаў**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб’ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваньня допісаў. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць допісы поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

**Апошні раз доўга я быў у Сьвіслачы гадоў з дваццаць таму: у маці здарыўся інсульт і я мусіў даглядаць яе ў раённай больніцы. На той час нядаўна пабудаваная, больніца была дасягненьнем: гмахі зь цёплай чырвонай цэглы, валуны на падстрыжаным газоне, блакітныя елкі ды чырвоныя кітайскія рыбы ў басэйне. Маці ляжала ў старым флігелі, што флянкіраваў новы корпус справа. Раней флігель быў часткай комплексу Сьвіслацкай гімназіі, у якой вучыўся Кастусь Каліноўскі. І вось я зноў у Сьвіслачы з тае самае нядобрае нагоды: захварэла мая, старэнькая цяпер ужо, маці.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Больнічны вэстэрн

## Хварэць у вёсцы

Мяне выклікалі, калі яна аблегла пасьля грыпу. За дзень прыяжджала «хуткая», але забраць у больніцу не схацелі — наказалі з хрыпамі ў лёгкіх везьці на абсьледаваньне да тэрапэўта ў сельсавет. Немаладыя сваякі не далі рады. Накупілі лекаў, вітамінаў дый патэлефанавалі дзецям. Хворая дзён пяць толкам ня ела, піла толькі з лыжкі. Не магла глытаць цьвёрдае. Фэльчарка пагаджалася даваць уколы, толькі калі яе будуць падвозіць (да ФАПу паўкілямэтра). Таму антыбіётыкі калоў мацеры выпадковы чалавек.

Наслухаўшыся цераз край, як з прыстогнам дыхае хворая маці, я патэлефанаваў фэльчарцы і папрасіў рады альбо парады. Тая наказала выконваць прадпісаньні, а па большае зьвяртацца да «куставога» лекара ў Ханявічы, у сельсавет. Ханявіцкая тэрапэўтка накіравала да настую ж фэльчарку, каб атрымаць больш інфармацыі і прыняць рашэньне.

Фэльчарка памерыла ціск, праслухала, спытала, як ідуць лекі. Я кажу: як бы ў больніцу, бо дыханьне цяжкае, маці нічога ня можа есьці ды слабне. «Гады ў Вашай маці, павінны разумець...» Я тэму ўзросту закрыў рашуча. Ускладненьне пасьля грыпу — вось што тут праблема, а ня ўзрост.

Праз паўгадзіны пасьля візыту фэльчаркі пазваніў ханявіцкай тэрапэўтцы. Шукайце, кажа, колы і вязіце да мяне на флюараграфію. Як я, кажу, павязу ляжачую хворую па завеі на выпадковым транспарце? А ў нас, кажа лекарка, няма шафёра на «хуткай». Шукаю нумар «хуткай». (Заадно даведваюся, што ў Поразаве амаль цэлая старонка Шалкевічаў.) «А, гэта куды мы прыяжджалі на днях, — пазнаюць на «хуткай». — Трэба грунтоўна абсьледаваць? Ну добра, едзем».

Прыехалі. Устанавілі запаленьне правага лёгкага і павезьлі ў больніцу. Па дарозе заехалі ў Поразаўскую амбуляторыю, каб паказаць хворую дыплямаванаму тэрапэўту. Той пацьвердзіў дыягназ. Пісаў з паўгадзіны. Па дарозе ў Сьвіслацкую больніцу я даведаўся, што на раён езьдзяць усяго дзьве «хуткія» і, калі накіраваньня ў стацыянар няма, трэба ехаць дахаты сваім ходам. А аркуш раскладу руху аўтобусаў на шыбе замкнёнай аўтастанцыі ў Поразаве амаль белы-чысты.

## Крутыя правінцыйныя гісторыі

Мне без асаблівых цяжкасьцяў, калі не лічыць дзьве простыя забароны, дазволілі пабыць ля маці пару дзён. Пакуль яна не пачала дыхаць на поўныя грудзі, піць сама з шклянкі і нават есьці суп і кашу.

У першы вечар, асвойтаўшыся, я падумаў: дзіўна — дома антыбіётыкі калолі два разы на дзень, парашкі прыгаршчамі давалі, а ў больніцы вось ужо паўдня як нічога. Спытаўся ў мэдсястры на вахце. Тая паглядзела ў картцы: «А якія лекі ёй давалі?» Я перад ёю ўвесь пакет расклаў, што прывёз з дому. «Вось, — кажа, — гэты ўкол трэба даць». А каб я не падышоў, думаю, так да ранішняга абыходу і дацягнулі б. У першы і другі вечар мне дазвалялі кіпяціць ваду, каб расчыняць вітаміны. Праз дзень зьмена памянялася. Падыходжу да паста па чайнік, а новая мэдсястра кажа: «А гэта наш прыватны».

Чуў я і гісторыі больш крутыя. Нібыта адну пэнсіянэрку — ударніцу працы 80 гадоў з грыпам позна ўвечары з апошняга аўтобуса не схацелі афармляць у больніцу, адправілі дахаты. Дык яна сказала, што сядзе ў сьнег насупраць прыёмнага пакою і будзе сядзець, пакуль не замерзьне. Пасьля гэтага ўзялі.

Канчатковы дыягназ маці быў пастаўлены толькі на другі дзень. Запаленьне лёгкіх аказалася двухбаковым і спрычынілася дзеля позьняга пачатку лячэньня да інтаксыкацыі арганізму. Была прапісаная і неадкладна пастаўленая кропельніца. Гэтая форма лячэньня была бясплатнай, бо я папрасіў доктара Жанну Аляксандраўну не рабіць зь мяне Крэза: грошай ужо амаль не было. Яна выпісала пігулак тысяч на дзесяць, акрамя таго, я купіў яшчэ базавыя лекі, запас якіх у больніцы якраз скончыўся, і заплаціў некалькі тысяч за масаж. Ня змог купіць болей за сорак шпрыцоў-«пяцёрак» для ўнутрымышачных ін'екцый. Аднак мэдсястра, якая настойліва раіла іх купіць, была задаволеная ўжо й гэтым, а рэшту без асаблівых праблемаў «калола» сваім шматразовым шпрыцам.

## Голасам клікаць трэба

У пяцімесным палаце хворых было дзьве. Мацерына суседка ляжала ціхенька. Падглядзеў, калі ня спала, і пачаставаў мандарынкай. Тая разгаварылася. Яе разьбіў паралюш, ніжняя палова цела ня слухалася. Здарылася гэта нанач, і яна як абсела на падлогу, так і прасядзела там, пакуль назаўтра папаўдні не знайшла яе суседка, устрывожаная, што вакол дому няма сьлядоў. Муж памёр тры гады таму пасьля цяжкай хваробы. Двое сыноў у Маскве, а дачка паблізу замужам, дык тая наведвалася.

Гаспадарку збыла: сілы няма. І гатовая была б ехаць да дзяцей у Маскву, але мае тут атрымаць кампэнсацыю за мужаву працу ў Нямеччыне. Адзін раз амаль ужо атрымала, ды напісаў у амбасаду нехта зь вяскоўцаў, што яна памерла. Пачалі правяраць наноў. Той нямецкай выплаты — паўтара году ў калгасе ўлягаць трэба. Яна вось і прывязвае ды вольная вясковая прырода. Але цяпер куды ехаць, хіба на клады — вось куды, кажа са скрухай, бы думае ўслых.

У палатах старыя ложкі. На адмысловых трубах і флянцах у галаве кожнага так і засталіся незапоўненымі дзіркі для кнопак алярмвыкліку мэдсястры. «Голасам клікаць трэба», — казала намесьніца галоўнага лекара. Новая рыса — у кожным аддзяленьні ёсьць «сацыяльны» ложак, заняты ляжачымі старэчамі з Дабравольскага дому састарэлых. Тых часта кладуць на абсьледаваньне, і сваякі іх потым тыднямі не забіраюць. Таму ў аддзяленьнях патыхае фізіялёгіяй і санітаркі жаляцца, што іх за гэта «прасуе» начальства.

## Якраз выпраўлялі ў салдаты

У мястэчку на вуліцах шмат немаладых твараў. Маладыя, якія мне траплялiся, у асноўным мелі твары і манеры навучэнцаў ПТВ. А можа, мне не пашчасьціла з часам прыезду, бо якраз выпраўлялі ў салдаты і народ быў у рознай ступені ачмурэньня. Паглядзеў на помнік Сталіну — адзіны ў краіне. Стаіць гэты фабрыкат эпохі Лу як дакор суседняму Траўгуту, побач зь імі й Ленін, закарэлы ад бронзавай фарбы, і яшчэ нехта сьвежы бяз надпісу, але па форме ня надта адрозны ад Вусатага... Ніякавата. Месьцічы, асабліва інтэлектуалы, не ўхваляюць зьяўленьня генэралісімуса. Жаляцца на беспрацоўе і бесьпэрспэктыўнасьць.

У мястэчку не працуе аніводнае больш-менш значнае прадпрыемства. Цыркулююць чуткі пра ліквідацыю раёну і яго падзел паміж Ваўкавыскім і Бераставіцкім.

Новая Сьвіслацкая паліклініка. Неахайна кінуты лінолеум ужо шмат дзе адтапырыўся, бы закарэлая сьвіная скура. Вушакі кепска зробленых дзьвярэй у кабінэты заквэцаныя дрэннай фарбай. Але людзі ў паліклініцы працуюць нязлыя, зычлівыя. Адно што многа іх, як для такога невялікага будынку.

Мястэчка «раскрылі», зрэзаўшы шмат вялікіх дрэваў, і відно, як дарэчы сучасная прыбудова да школы імя Каліноўскага (з адзіным у краіне помнікам яму). Ззаду школы ўплішчылася нейкая худая, бы падстрэленая, царква. Яшчэ ў стадыі збудаваньня. На цэнтральным пляцы знак намэнклятурнага адраджэньня — Дошка Пашаны. Вялізныя фота ў асноўным няфотагенічных людзей з надпісамі.

У апошні дзень мяне настойліва схілялі апрануць белы халат, выменяўшы яго ў гардэробе на куртку. Але халат каштаваў нейкія невялікія грошы, а іх у мяне больш не было, так што я ўхіляўся да канца і захаваў суму на білет да Поразава.

## Хлебавозы

За Поразавам езьдзіла пара «іншамарак». То былі паляўнічыя, якія цікавалі з шашы на зайцоў, ды спэцыялісты саўгасу «Поразаўскі», што жывуць на ўзлобку за мястэчкам. Каля іхняга блёку стаялі два крыжы — каталіцкі і праваслаўны — у адной агароджы.

У Навасадах я засьпеў дызэльны бус «Фальксваген». Уключыўшы сырэну, гаспадары склікалі цётак па хлеб. За вёскай бус дагнаў мяне. Я галасануў, і маладыя — ён за рулём ды яна, лічачы выручку, — падвезьлі мяне да наступнай вёскі. Маюць міні-пякарню ў Ваўкавыску і прадаюць па вёсках якасны хлеб ды булкі. Робяць канкурэнцыю дрэннаму хлебу мясцовага заводу. З дазволу прэзыдэнта, сказалі. Гэтым задаволеныя, але ня пэўныя, ці пасьпеюць акупіць выдаткі на абсталяваньне. Гэта значыць, няпэўныя, ці надоўга той дазвол. Скардзяцца, што ім задорага прадаюць муку. Мая цікаўнасьць упэўніла, што я з сфэры палітыкі. «Дэпутат, няйначай?» — «Не, апазыцыя, БНФ. У дэпутаты нас не пускаюць». — «Дык вось чаму па-беларуску гаворыце». — «Не, мы ня тое што мову, мы хочам увесь край гэты вярнуць у Эўропу. Будзе тады вам стабільнасьць».

**Яўген Бяласін,**
Берасьце — Сьвіслач — Задворані — Берасьце.
Студзень 2004



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Хлопцы, робім так

**Упершыню беларуская зборная стартуе ў элітнай групе Кубку Дэвіса, і адразу фартуна зьвяла нашых гульцоў з Расеяй. Максім Мірны (на дзымку), Уладзімер Ваўчкоў, Аляксандар Швец і Андрэй Каратчэня 6—8 лютага будуць біцца з расейскімі тэнісістамі за выхад у наступны этап Кубку Дэвіса. 5 лютага ў Менскай ратушы пацягнуць жэрабя, а 6-га а 15-й пачнуцца матчы. Асаблівая ўвага будзе прыцягнутая да лідэраў-супэрзорак — Максіма Мірнага і Марата Сафіна. Кожны з расейцаў трохі пераўзыходзіць нашых у клясе, але за нашымі хлопцамі — падтрымка залі й тэлегледачоў (матчы будзе трансьляваць АНТ). Вырашыць натхненьне.**

## 28 бізнэсмэнаў

пачалі ў Віцебску бестэрміновую галадоўку на знак пратэсту супраць дзеяньняў улады. Сярод іх патрабаваньняў — адмена ўвядзеньня касавых апаратаў, пераводу крытых рынкаў у статус гандлёвых цэнтраў, за што з прадпрымальнікаў бяруць вялікія грошы, і адстаўка намесьніка старшыні Віцебскага гарвыканкаму Ўладзімера Яравікова ды загадчыцы гараддзелу гандлю. Галадоўшчыкі пратэстуюць проста на рабочым месцы — у памяшканьні прыватнага крытага рынку «Мішэль». Леташняя перамога ваўкавыскага прадпрымальніка Аўтуховіча дае надзею, што сьцяну бюракратыі можна праламіць хоць бы цаной уласнага здароўя.

## Віктар Юшчанка

сьвяткуе перамогу. Леанід Кучма быў вымушаны адмовіцца ад намеру абірацца прэзыдэнтам на трэці тэрмін або вызначаць пераемніка («Украіна — не Расея. У нас не было цароў, а былі гетманы, якіх абіраў народ», — заявіў ён.). А паслухмяная прэзыдэнту парлямэнцкая большасьць адхіліла раней ёю ж прапанаваную зьмену ў канстытуцыі, што прадугледжвала абраньне прэзыдэнта парлямэнтам, а не ўсеагульным галасаваньнем. Паўнамоцтвы прэзыдэнта будуць абмежаваныя, а прэм'ера — пашыраныя. Варта нагадаць, што апазыцыя месяц паралізавала працу Вярхоўнае Рады і сабрала 3 мільёны подпісаў у сваю падтрымку.

**Сяргей Мікулевіч**

**13—16 лютага**
**6—9 сакавіка**
**«Золота Підкова Львоўшчыны»**
Экскурсія па Львове + 6 замкаў
**Жоўква** — места-фартэцыя, адмыслова збудаванае ў 1594 г.; **Алеськ** — замак XIII — XVIII ст.; **Падгорцы** — замак XVII ст. (позьні рэнэсанс), барочны касьцёл, «італьянскі» парк; **Крэхіў** — ансамбль базылянскага кляштара XVII—XVIII ст.; **Залочыў** — замак Сабескіх і Радзівілаў XVII—XVIII ст.; **Сьвірж** — замак XVI—XVII ст., рэнэсансны касьцёл, **Львоў.**
Тэлефануйце: 8-029-755-03-70, 222 88 61, т/ф. 222 88 76. http://altusplus.narod.ru. Два дні — 45 у.а.
Студэнтам зьніжка.



**Запрашаем на падарожжа 8 лютага** (нядзеля) па маршруце: Менск — Залесьсе — Смургоні — Кушляны — Жупраны — Ашмяны — Гальшаны — Баруны — Крэва — Менск.
Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер)
Т.: 264-12-38, 776-24-35 (Павал)




**На платныя прыватныя абвесткі (для прыватных асобаў), на старонку 16 рэклямныя расцэнкі:** да 20 словаў (тэкставы модуль) 2100 руб., за кожныя наступныя 20 словаў (тэкставы модуль)— 2100 руб. Афармленая абвестка з улікам кошту арыгінал-макету за 1 кв. см. — 360 руб.

**Наша Ніва** КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

**Тэкст** __________

**Імя і прозьвішча** __________

**Адрас, тэлефон** __________

**15 лютага**
**Крэва — Баруны — Гальшаны**
**Легенды Паданьні Закляцьці**
Праграма туру:
**Крэва:** замак (руіны), 1338 г., касьцёлПератварэньня Господняга (1934—36 г.), царква Сьв.Аляксандра Неўскага (1854 г.). **Баруны:** касьцёл (1754—57 г.), званіца (сярэдзіна XVIII ст.), капліца (2-я палова XVIII ст.), кляштар (1778—93 г.). **Гальшаны:** сьвята Соф'і Гальшанскай: сярэднявечныя танцы і гульні, замак (руіны), 1-я палова XVII ст., касьцёл францысканцаў (1618 г.), манастыр францысканцаў (17 ст.). Кошт — 20 тыс. руб. для дзяцей і 23 тыс. для дарослых. Тэлефануйце: .222-88-61; т/ф.: 222-88-76, http://altusplus.narod.ru

Sion COMPUTERS
Шаноўнае Спадарства!
Прапануем Вам па нізкіх коштах якасныя і надзейныя камплектавальныя.
У межах Менскай вобласьці магчыма дастаўка.
Бясплатныя кансультацыі.
Duron1400/KT333/DDR128/GF2 32/HDD40G 242 у.а.!
296-65-90 776-75-84 655-80-95
ліц. №40006 (30.10.03/08) МГВК

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### КАНТАКТЫ

**Набіраем падрыхтоўчую клясу ў беларускую гімназію** №23 (каля пляцу Якуба Коласа). Т.: 251-95-90 (Марына)

**Спатканьне па «Хрысьціянскай дэмакратыі ў Беларусі»** ў Горадні 7 лютага а 17-й па вул.Будзёнага 48а-71

**6 лютага фэст** «У сэрцы з Каліноўскім» да дня нараджэньня народнага героя. Запрашаем паэтаў, песьняроў, мастакоў, публіку ў Дом літаратара а 17.00. Пагонічы

**Шаноўная моладзь!** Запрашаем вас на беларускую дыскатэку з нагоды Дня сьв. Валянціна. Клюб «Тунэль», 10 лютага з 18 да 21-й

**Дзень сьвятога Валянціна:** сьвяточнае шоў з абыходам амбасадаў 14 лютага, 12.00, пл.Свабоды. Чакаем. Сябры

**Перапрашаю сп.Шыбеку** за не зусім удалы выступ у часе прэзэнтацыі ягонай цудоўнай кніжкі «Нарыс гісторыі Беларусі 1795—2002», 20.01.2004 у гістарычнай майстроўні на Жыдоўскай. Хацелася як лепей... Жадаю новых прэзэнтацый. Дылетант

**А.Глёбусу (Масква, РБ) і С.Адамовічу (Нарвэгія).** Прадаецца мэгасюжэт для эратычна-парнаграфічнага газэтнага трылеру-сэрыялу, заснаваны на рэальных падзеях (з вуснаў галоўнага героя праз трэція вусны) — тэрмаядравае каханьне інспэктара па тэхніцы бясьпекі і маладзенькай топкранаўшчыцы аднаго зь менскіх заводаў. Т.: 291-55-63

**Сьвядомыя беларусы** зь Дзятлаўшчыны! Адгукніцеся! Давайце знаёміцца! Алеся, в.Сачыўляны. Т.: 36-4-22

**Дзяўчына Алена** ня ведае, чым пакрыўдзіла высокага прывабнага менчука, і просіць прабачэньня. Андрэй, прабачце, калі ласка!

**Сьвятлана** зь Віцебску! Адгукніся! Лістуй на zahodsonca@tut.by. Чакаю... Алег

**Віншуем** спадарыню Магучаву Тацяну з Днём народзінаў. Ліцэісты, 41 гр.

**Віншую свайго** сябра Віталя Манька з 18-годзьдзем. Зрабі з гэтай вёскі горад! Руслан з Баранавіч

**Сутнасьць** угледзіш праз гэтыя словы: «Любоў да Радзімы. Павага да мовы». Моладзевая ініцыятыва «Вока». voka@day.by

### КНІГІ

**Кнігі — поштай.** Замаўляйце каталёг: поштай — а/с 333, 220050, Менск, e-mail: exlibris@tut.by, Internet: http://www.knihi.net. Т.: 8-029-643-57-33

**Кнігі — поштай. Новыя**: КЛЯШЧУК Анатоль «Пад небам Беларусі» (фотаальбом), «Czasopis» №1/2004. Т.: 8-029-643-57-33, exlibris@tut.by.

**«Навінкі-magazine»** у Мазыры! Замовы дасылайце на alehmzr@tut.by

**Набуду** 1 том ТСБМ, што ў 5 тамах. Т.: 238-80-17

### ПРАДАМ

**Кампутар** Pentium-200/32 Mb/Video 6 Mb/HDD 1,76 Gb/kb/m+манітор 15´´ (Word, кліпы) — 110 у.а. Т.: 8-029-775-18-07. Віталь

**DVD-прайгравальнік** «Orion», новы, гарантыя — 100 у.а. Т.: 202-18-35

**Танна** сукно-драп шынэльнае. Т. (у Пружанах): 2-10-79

### ПРАЦА

**Шукаю** працу для дачкі. Малады спэцыяліст. Зубная лекарка. Аршанская мэдвучэльня. Разьмеркаваньне ў лютым. Т.: (02161) 52-5-40. Генадзь

**Якасна** выканаю пісьмовыя працы па беларускай мове, літаратуры, гісторыі. Т.: 235-18-71 (Юрась)

**Цікавая,** карысная ды пэрспэктыўная праца для Вас. Т.: 8-029-766-12-79

**Зьбіраю** супрацоўнікаў для працы ў фірме. Т. (у Слуцку): 6-19-64. Віктар

**Калі Вы** хочаце замовіць натуральную швэдзкую касмэтыку «Oriflame», тэлефануйце ў Слуцак: 6-19-64. Віктар

### СПАЧУВАНЬНЕ

**Бабруйская** гарадзкая арганізацыя БНФ выказвае шчырае спачуваньне родным і сваякам свайго сябра Карнеева Ўладзімера з прычыны яго раптоўнай сьмерці

### ВЕРШ НА КУПОНАХ

На Беларускія абшары
Прыйшла зіма.
Як колер нашай даўняй мары,
Як сон яна.
Вакол нішто не зварухнецца,
Куды ні кінь,
Але калісьці абарвецца
Сон ў весьнім дні.
Растане колер зімны, сьнежны,
Вада зьбяжыць.
А зь белай мары ўстане вежа,
Каб нам ў ёй жыць.

**Андрэй Валошка**

Людка Сільнова



# Высокі пакой

I.
За вокнамі — від гарадзкі, беларускі:
Дамы — абутковыя скрынкі ды вузкі

Асфальтавы пас, як прашытай, дарогі.
(Аўто... мінакі — ўсё галовы і ногі...).

II.
А тут, каля песенек вечных фантану
(Здаецца, Кутуньё або Чэлентана), —

Маўклівая споведзь за келіхам соку
Ў пакоі... паверце, што самым высокім!

III.
І сьцены кватэры — убок адплываюць,
Калі тыя двое свой час дапіваюць...

Нядзеля. Свабода. Уяўная выспа.
Найноўшы парадак... І неба — так блізка!

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Крысьціне П. зь Менску.** Рэцэнзія на «Зьнесеных прывідамі» запазьнілася на колькі месяцаў, на анімэ ўвогуле — на колькі гадоў.

**К.-А. Г., Ігару Ч. зь Менску.** Уздымайцеся вышэй прыватных уражаньняў — да абагульненьняў.

**Ігару П. з Паставаў.** Ваш аповед — для літаратурнага часопісу. Перадаём яго ў «Дзеяслоў».

**Язэпу Т. зь Менску.** Выдатных Вам адзнакаў!

**А.Ч. з Маладэчна.** Апавяданьне не ўдалося. За вершы дзякуй.

**Тацяне Б.** зь Менску. Апавяданьне Жадана не газэтнае. Прапануйце яго часопісу «Arche».

**Антону В. з holiday.by.** За дасланае паведамленьне дзякуй, але надалей хацелася б атрымліваць ад Вас арыгінальныя аўтарскія артыкулы.

**Уладзімеру Т. зь Маладэчна, Сяргею Б. з Гомелю, Сяргею П. з Барысава.** Тысячы людзей у краіне адчуваюць дыскамфорт ад небеларускасьці сьвятаў і тэлевізіі, ад таго, што няма адзінага разуменьня нацыянальнае ідэі. Але чытаньне з году ў год гермэтычных тэкстаў з параўнаньнем таго, што ёсьць, з тым, што хацелася б мець, перастае прыносіць асалоду. Газэта чакае ад Вас рэфлексіяў на іншыя тэмы і інфармацыі. Жыцьцё ляціць наперад, не адставайце. Чым больш адкрытымі да жыцьця будзеце, тым цікавей будзе Вам пісаць, тым больш людзей прыцягнеце да беларускае справы (здаецца, менавіта гэтага Вы прагнеце).

«Наша Ніва» дзякуе за падтрымку спадарыні Івонцы Сурвільле.

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
выпускны рэдактар — Арцём Лява
карэктар — Сяргей Петрыкевіч
карэктарка — Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар — Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск код 764.
Наклад 3598. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 22.00 28.01.2004.
Замова № 695.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а